ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. зьдачку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СУБОТА
26 красавіка 1930 г.
№ 97 (3505)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Увага—агляду грамадзкага харчаваньня

Гэтымі днямі ў Маскве ў рэдакцыі «Правды» адбылося пасяджэньне Усесаюзнай камісіі па агляду грамадзкага харчаваньня, на якім Беларуская камісія зрабіла даклад аб ходзе агляду і аб першых яго выніках у БССР.

Ня гледзячы на тое, што агляд ідзе ўжо на працягу паўтара месяцаў, што ідэя яго дастаткова папулярызавана ў шырокіх рабочых масах, што вакол яго арганізаваны вялікі рабочы актыў, на сёньешні дзень агляд усё-ж рэальных вынікаў ня даў.

Бязумоўна, што ў працэсе агляду праблема грамадзкага харчаваньня высунута ў цэнтр грамадзкай увагі, бясспрэчна і тое, што агляд грамадзкага харчаваньня ператварыўся ў масавую кампанію, але-ж вынікі агляду нездавальняючыя. Якія-ж прычыны?

Шырокія рабочыя масы аглядам зацікаўлены. Яны актыўна дапамагаюць выявіць і зьнішчыць усе хваробы і ненармальнасьці ў грамадзкім харчаваньні, дапамагаюць наладзіць яго. Але ўдзел у аглядзе ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, вельмі слабы, а таму часамі каштоўная рабочая ініцыятыва застаецца без кіраўніцтва, застаецца нескарыстанай. Цэнтральныя праўленьні саюзаў або проста не даацэньваюць значэньня агляду, або абмяжоўваюцца парадными дэкларацыямі ў выглядзе прыгожых рэзалюцый і пастаноў, якія застаюцца на паперы і практычна ня выконваюцца. Фабзаўкомы фабрычна-заводзкім агладавым актывам зусім ня кіруюць, на некаторых прадпрыемствах усё яшчэ раскапыхваецца і няма ніякай практычнай работы.

Мы маем выпадкі і простага скрыўленьня ідэі агляду (адміністраваньне і інш.).

Грамадзкае харчаваньне ў Беларусі, бязумоўна, культае. Сетка ўстаноў грамадзкага харчаваньня ахапляе надзвычай нязначны процант спажыўца, становыя перагружаны, не абсталяваны, брудныя. Якасьць харчаваньня надзвычай дрэнная, а цэны высокія. Усё гэта гаворыць аб тым, што ў працасе агляду праблема будаўніцтва новых ачагоў грамадзкага харчаваньня стаіць ва ўсю шырыню. Але калі гэта будаўніцтва разгарнулася, калі сотні новых сталовых па БССР ужо будуюцца, гаспадарчыя органы палец аб палец ня стукнулі для таго, каб забясьпечыць гэта будаўніцтва патрэбным абсталяваньнем. Гэта значыць, што агляд прайшоў міма гаспадарчых органаў.

Арганізацыя харчаваньня ў вясковым сэктары ў часе палявых работ сарвана. Дзяржплян і Эканомнарада, пратрымаўшы пляны арганізацыі гэтага харчаваньня больш месяца, ужо ў часе сяўбы прызналі іх (гэтыя пляны) няжыцьцёвымі. Белкаапсаюз і Белкалгасцэнтр займаюцца ведамсьцьвенымі спрэчкамі—хто павінен кіраваць вясковай сеткаю грамадзкага харчаваньня. Між тым, зараз па ўсіх раёнах БССР сяўба ўжо праходзіць, а на палёх ніводнае перасоўнае кухні.

У сувязі з разгорнутым будаўніцтвам устаноў грамадзкага харчаваньня ва ўвесь рост паўстае задача падрыхтоўкі кадраў грамадзкага харчаваньня. Папепшыць грамадзкае харчаваньне, паставіць яго на патрэбную вышыню без наяўнасьці кадраў не магчыма. Ні Наркамасьветы, ні Наркамзем, ні каапэрацыйныя арганізацыі не падумалі над пытаньнем арганізацыі ня толькі спэцыяльнага тэхнікуму, а нават няма ніякага ўспаміну аб разгортваньні фабрычна-заводзкага вучнёўства ў тых разьмерах, у якіх гэта праектавалася прафсаюзнымі арганізацыямі.

Перад беларускай аглядавай камісіяй, перад усёй грамадзкасьцю стаіць рад вялікіх задач у БАРАЦЬБЕ ЗА КАНКРЭТНЫЯ ДАСЯГНЕНЬНІ, ЗА ВЫНІКІ АГЛЯДУ. Перш за ўсё увесь агонь крытыкі і самакрытыкі вакол агляду грамадзкага харчаваньня З УСЁЙ СІЛАЮ НЕАБХОДНА НАКІРАВАЦЬ НА КАНКРЭТНЫХ НОСЬБІТАЎ ЗЛА, Г. ЗН., ШТО КОЖНЫ, ХТО НЕ ДААЦЭНЬВАЕ ЗНАЧЭНЬНЯ АГЛЯДУ, УСЯКІ, ХТО ТАРМОЗІЦЬ ЯГО І ЗРЫВАЕ ВАЖНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА ПАЛЯПШЭНЬНІ ЎСЁЙ СЫСТЭМЫ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ, ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКРЫТЫ ПЕРАД УСЁЙ ГРАМАДЗКАСЬЦЮ. Трэба арганізаваць дакладны ўлік рабочых прапаноў і прасачыць за іх выкананьнем.

Прафсаюзныя арганізацыі, гаспадарнікі і каапэратары павінны неадкладна ўліцца ў агляд і заняць у ім патрэбнае месца. Пытаньні кіраўніцтва масамі ў аглядзе, пытаньні абстаеляваньня, кадраў, пытаньні арганізацыі грамадзкага харчаваньня ў вёсцы павінны быць прасунуты ў цэнтр грамадзкай увагі і ў працасе агляду ў што-б там ні стала вырашаны.

Буйныя рабочыя раёны і округі БССР пасьля выкананьня гэтае працы павінны правесьці шырокія канфэрэнцыі ўдзельнікаў агляду грамадзкага харчаваньня, НА ЯКІХ НЕАБХОДНА ПАДАГУЛІЦЬ ПРАВЕДЗЕНУЮ РАБОТУ, УЛІЧЫЦЬ УСЕ ДАСЯГНЕНЬНІ І КАНКРЭТНЫЯ ВЫНІКІ АГЛЯДУ І ДАПАМАГЧЫ ВЫЗНАЧЫЦЬ КОНТУРЫ ПЯЦІГОДКІ Ў ГРАМАДЗКІМ ХАРЧАВАНЬНІ СВАЙГО РАЁНУ І АКРУГІ.

На Ўсесаюзную нараду па грамадзкім харчаваньні, якая адбудзецца ў чэрвені месяцы, БЕЛАРУСКІ АГЛЯДАВЫ АКТЫЎ ПАВІНЕН ПРЫЙСЬЦІ З КАНКРЭТНЫМІ ВЫНІКАМІ АГЛЯДУ І З ВЫЗНАЧАНАЙ ПЯЦІГОДКАЙ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ Ў БССР.

Вакол ажыцьцяўленьня гэтых задач трэба мабілізаваць шырокія пласты грамадзкасьці. НЯ ВЫКАНАЦЬ ІХ—ЗНАЧЫЦЬ НІЧОГА НЕ ЗРАБІЦЬ. ЦСПСБ, ВСНГ, Белкаапсаюз, Калгасцэнтр, Наркамзем, Наркамаховы здароўя і Наркамасьветы павінны зараз-жа пераключыцца на актыўны ўдзел у аглядзе, які павінен даць цьвёрды грунт нашай пяцігодцы грамадзкага харчаваньня.

9 год „Чырвонай Зьмены“

„ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЕ“

БАЯВОМУ ОРГАНУ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛУ, АРГАНІЗАТАРУ РАБОЧЫХ, БАТРАЦКІХ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС МОЛАДЗІ—«ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЕ» У ДЗЕНЬ 9-ЦІГОДЗЬДЗЯ—БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ.

«ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА» ПАВІННА ЯШЧЭ БОЛЬШ УЗМАЦНІЦЬ СВАЮ РАБОТУ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ КАМСАМОЛЬСКІХ МАС І РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ НА ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАЧ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ. ЛЕПШЫМ СРОДКАМ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ГЭТАЙ РАБОТЫ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПАСЬЛЯДОЎНАЕ ЎЗМАЦНЕНЬНЕ САМАЙ ШЫРОКАЙ І САМАЙ ШЧЫЛЬНАЙ СУВЯЗІ З РАБОЧЫМІ, БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКІМІ І СЕРАДНЯЦКІМІ МАСАМІ МОЛАДЗІ І НЯЎХІЛЬНАЕ ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ РАДОЎ ЮНСЕЛЬРАБКОРАЎ.

РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ», ВІТАЮЧЫ «ЧЫРВОНУЮ ЗЬМЕНУ» З ДЗЕВЯЦІГАДОВЫМ ЮБІЛЕЕМ ГЛЫБОКА ЎПЭЎНЕНА, ШТО «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА» БУДЗЕ, ЯК І РАНЕ, ПАД ВЫПРАБАВАНЫМ ПАРТЫЙНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ НЯЎХІЛЬНА І ПАСЬЛЯДОЎНА ЎЗМАЦНЯЦЬ СВАЮ РАБОТУ ПА ВЫХАВАНЬНІ КАМСАМОЛЬСКІХ МАС У ДУХУ ЛЕНІНСКАЙ НЯПРЫМІРЫМАСЬЦІ ДА ЎХІЛАЎ АД ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, МАБІЛІЗУЮЧЫ КАМСАМОЛЬСКІЯ МАСЫ НА БАРАЦЬБУ З ПРАВЫМ АПАРТУНІЗМАМ—ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ І «ЛЕВЫМІ» ЗАГІБАМІ.

СВОЙ ЮБІЛЕЙ «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА» ПАВІННА СКАРЫСТАЦЬ ДЛЯ МАКСЫМАЛЬНАГА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ МАБІЛІЗАЦЫІ КАМСАМОЛЬСКІХ МАС НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН, ЗА БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ, НА БЕЗАДКЛАДНУЮ ЛІКВІДАЦЫЮ ПЕРАГІБАЎ І СКАЖЫНЬНЯЎ ПАРТЛІНІІ Ў КАЛГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ, ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСЫ, НА БАЗЕ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

«ЗЬВЯЗДА».

Рэвалюцыйны пралетарыят рыхтуецца да 1-га мая

Рэакцыя мабілізуе паліцыю для задушэньня выступленьняў рабочых

РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ПРАЛЕТАРЫЯТ БЭРЛІНУ ЎЗМОЦНЕНА РЫХТУЕЦЦА ДА 1-ГА МАЯ

БЭРЛІН, 25. За апошнія дні па ўсёй Нямеччыне ўзмацнілася падрыхтоўка рэвалюцыйных рабочых арганізацый да 1 мая. Штодзённа адбываюцца шматлікія сходы на прадпрыемствах, якія склікаюцца кампартыяй й рэвалюцыйнай прафарганізацыяй, а таксама сходы беспрацоўных. У буйных гарадох праводзіцца энэргічная прапаганда па дварох і кватэрах.

Сацыял-дэмакраты і рэфармісцкая прафсаюзная дэмакратыя зьвяртаюцца да грубых фальшывак, каб утрымаць рабочых ад удзелу ў дэманстрацыях, якія арганізоўваюцца кампартыяй. «Форвэртс» друкуе фальшывы цыркуляр Цэнтральнага Камітэту нямецкай кампартыі аб арганізацыі камуністымі асобных атрадаў для зрыву сацыял-дэмакратычных сходаў. «Ротэ Фанэ» заяўляе, што «цыркуляр», які друкуецца ў «Форвэртс», зьяўляецца чарговай фальшыўкай. «Ротэ Фанэ» зазначае, што «Форвэртс» зноў ужывае летаплюю практыку сацыял-дэмакратаў. У мінулым годзе, як зазначае «Ротэ Фанэ», старшыня бэрлінскай арганізацыі сацыял-дэмакратычнай партыі Кюнстлер распаўсюджваў перад 1 мая правакацыйнае паведамленьне, быццам на пасяджэньні Бэрлін-брандэнбурскага камітэту кампартыі гаварылася, што 1 мая 1929 г. будзе 200 забітых. Гэтая хлусьня потым ужывалася сацыял-дэмакратамі для адшкаваньня забойцаў 33 рабочых.

ЗАБАРОНА КАМУНІСТЫЧНЫХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ У БАВАРЫІ

БЭРЛІН, 25. Баварскі ўрад забараніў усе камуністычныя дэманстрацыі і першамайскія сходы. Сацыял-дэмакратычныя дэманстрацыі не забаронены. Баварская паліцыя заяўляе, што яна сілай не дапусьціць прыбліжэньня камуністых да сацыял-дэмакратычных дэманстрацый.

ПЕРШАМАЙСКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў БАЎГАРЫІ І ВЭНГРЫІ ЗАБАРОНЕНЫ

ВЕНА, 23. Скліканая ў Сафіі пашыраная канфэрэнцыя незалежных прафсаюзаў для падрыхтоўкі першамайскіх выступленьняў была закрыта паліцыяй, якая арыштавала 20 дэлегатаў. Клюб незалежных прафсаюзаў закрыт. У другіх гарадох Баўгарыі закрыты ўсе рабочыя клюбы, а члены першамайскіх камітэтаў арыштаваны. Забаронены першамайскія дэманстрацыі, усялякія сходы і канфэрэнцыі.

* * *

ВЕНА, 23. Вэнгерскі міністр унутраных спраў, забараніў усялякія дэманстрацыі і сходы ў дзень 1-га мая, а таксама ў нядзельныя дні за тыдзень да 1-га мая і праз тыдзень пасьля 1-га мая.

4-га мая г. г. а 6 гадз. увечары склікаецца

аб'яднаны пленум Мен. АК і АКК КП(б)Б,

З ПАРАДКАМ ДНЯ

1. Справаздача АК КП(б)Б (т. СЛАВІНСКІ).
2. Аб далейшых задачах у галіне калектывізацыі сельскай гаспадаркі (т. ТАМАШЭЎСКІ).
3. Вынікі чысткі партарганізацый т. (ДАМБРОЎСКІ).
4. Пытаньні VIII-ай партканфэрэнцыі.

Сакратар Мен. АК КП(б)Б СЛАВІНСКІ.

ФАРСАВАЦЬ СЯЎБУ Ў ПАЎДНЁВЫХ АКРУГАХ

Калгасы, выконваючы пасеўныя пляны, арганізуйце індывідуальнікаў, дапамажэце ім

Працоўная дысцыпліна ў занякадзе

У калгасах Случчыны ігнаруюць якасьць сяўбы

СЛУЦК. (Наш кар.). У радзе калгасаў зусім не зварачаюць ніякай увагі на якасьць сяўбы. У прыватнасьці, вельмі расьцягваецца сяўба.

У калгасе «1-га Жніўня» (Урэцкі сельсавет) сеюць авёс непратручаным. Для ўгнаеньня глебы тут быў сабраны попел. Але чамусьці лён пасеялі, а попел... застаўся ляжаць у хляве. У калгасе ёсьць вапна, якой зьбіраліся вапнаваць глебу, але гэтага ня робяць. Купілі касьцяной мукі, між тым, яна таксама не скарыстана.

Яшчэ горш стаіць справа ў калгасе «Чырвоны Працаўнік» (Сьліўскі сельсавет), дзе выкананьне пляну сяўбы — пад яўнай пагрозай. На работу выходзіць штодзенна 15 чалавек, у той час, як у калгасе напічваецца 50 гаспадарак. Між тым, нават з 15 працуючых чалавек частка занята дастаўкай у поле насеньня і корму жывёле.

Працоўная дысцыпліна ў калгасе «Чырвоны Працаўнік» моцна кульгае. Некаторыя калгасьнікі па некалькі дзён не зьяўляюцца на работу.

З 4 сяварак, якія ёсьць у калгасе, толькі 1 працуе ў полі, астатнія—«адпачываюць». Тут лічаць за лепшае сеяць рукамі. Прадукцыйнасьць працы пры такіх парадках вельмі нізкая. За тыдзень засеяна ўсяго 20 гэкт, аўсу — 25 проц. пляну. Калі такія тэмпы будуць працягвацца, дык адзін авёс прыдзецца сеяць 4 тыдні. Гэта ў той час, калі ў іншых калгасах ужо садзяць бульбу. У «Чырвоным Працаўніку» бульба яшчэ знаходзіцца ў капцох, не агледжана і не перабрана.

Калгас «1-га Мая» адчувае вострую настачу цягавай сілы, што пагражае яму недасевам. Калгас чакае дапамогі, а сам не выяўляе ініцыятывы, каб дастаць коняй. Крэдыты на гэтыя мэты ёсьць у мясцовым крэдытным таварыстве, але праўленьне калгасу чамусьці ня лічыць патрэбным іх узяць.

ЗУРНОВІЧ.

Сяўбой у індывідуальным сэктары ня цікавяцца

Сяўбой у індывідуальным сэктары ўсё яшчэ ня цікавяцца як раённыя, так і сельсавецкія арганізацыі Полацкага раёну. Плян пасеўнай кампаніі яшчэ не даведзены нават да сельсаветаў.

Пры адводзе яравога кліну індывідуальнікам дапускаюцца грубейшыя скажэньні дырэктыў. У радзе месц ён адводзіцца на адлегласьці 5-8 кілёмэтраў ад вёскі, пры чым зямля часта зусім нязадатная для сяўбы. У некаторых сельсаветах у яравы клін калгасаў адводзяцца гароды індывідуальнікаў (напрыклад, камуна «Чырвоная Зорка», калгас імя Варашылава).

Перагібы пры зямляўпарадкаваньні кулак скарыстоўвае ў сваіх мэтах, вядучы агітацыю за скарачэньне пасеўнай плошчы індывідуальнікамі.

Кантрактацыя яравых па індывідуальным сэктары правалена. Крэдыты, адпушчаныя для індывідуальных гаспадарак, не скарыстаны. З беднатой, якая не ўвайшла ў калгасы, ніякай працы не вядзецца.

Такое становішча ў раёне у той час, калі індывідуальны сэктар складае ў ім 81 проц. двароў.

Брыгадзіры «Зьвязды» Міновіч і Халявін.

Чаму распаўся калгас

Прыблізна 2 месяцы таму назад Калгасцэнтр СССР выдаў пастанову, якой катэгарычна забараняецца прымусова навязваць калгасьнікам кандыдатуры выбарныя органы калгасаў.

У калгасе ў вёсцы Блонь Пухавіцкі райком імкнуўся навязаць кандыдатуру Жлобіча ў старшыні калгасу, сяляне выказваліся супроць гэтай кандыдатуры. Але райком дамагаўся свайго. З гэтае прычыны 147 сялян вёсак Блонь і Зарэчча выпісаліся з калгасу. Партыйныя і савецкія арганізацыі раёну павінны тэрмінова выправіць дапушчаныя памылкі.

Чырвоны.

Зводкі з пасеўнага фронту

МАГІЛЕУСКАЯ АКРУГА

МАГІЛЕЎ. (Па тэлеграфу ад нашага карэспандэнта). Паводле вестак па 20-га красавіка **калгасамі Магілеўшчыны засеяна 7.823 гэкт. або 9,6 проц. яравога кліну.** Пшаніцы ў калгасах засеяна 962 гэкт. або 40 проц. пляну, ярыцы (яравога жыта)—59 гэкт. або 33 проц., ячменю 3.056 гэкт. або 36 проц.

Індывідуальнымі гаспадаркамі засеяна ў акрузе 17.064 гэкт. або 4,8 проц. яравога кліну.

У паасобных раёнах калгасы па некаторых культурах перавыканалі пляны. Напрыклад, у Чэрыкаўскім раёне па ячмені калгасы выканалі 110 проц. пляну, у Касьцюковіцкім—91 проц., у Хоцімскім—70 проц.

Па пшаніцы ў Клімавіцкім раёне калгасы выканалі 115 проц. пляну, у Чэрыкаўскім—50 проц. і ў Чаўскім—32 проц.

МАЗЫРСКАЯ АКРУГА

МАЗЫР. (Па тэлеграфу ад нашага карэспандэнта). Сяўба ў акрузе праходзіць марудна. На 20 красавіка калгасамі засеяна 4.675 гэкт.—17 проц. пляну. Пшаніцы калгасамі засеяна 223 гэкт. (38 проц. пляну), ільну—121 гэкт. (9,6 проц.), гародніны—8 гэкт. (1 проц.).

Індывідуальнымі гаспадаркамі ў акрузе засеяна 16.040 гэкт. (14,5 проц. пляну), у тым ліку пшаніцы—972 гэкт. (45 проц.), ільну—778 гэкт. (13 проц. і гародніны—47 гэкт. (1 проц.).

Плян сяўбы канюшыны выканаць калгасамі на 26 проц., індывідуальнымі гаспадаркамі—10 проц. Дзесяць тон насеньня канюшыны ляжаць на складах нескарыстанымі і ў бліжэйшыя дні адпраўляюцца ў іншыя акругі.

Зьдзельшчына ўзьнімае прадукцыйнасьць працы

У Сенінскім раёне, (Віцебшчына) перавод раду калгасаў на зьдзельную аплату працы стварыў сапраўдную эканамічную рэвалюцыю. Папершае, выявіліся недахопы старой падзённай сыстэмы. Наглядаліся выпадкі, калі фактычная выпрацоўка аднаго складала 20 кап., а другога—звыш рубля. Атрымлівалі-ж яны аднолькава—па 45 кап. **Зразумела, гэта адбівалася вельмі дрэнна на прадукцыйнасьці працы.**

Зараз, з пераходам калгасаў на зьдзельную аплату, настрой калгасьнікаў значна палепшыўся. Многія сяляне падаюць заявы аб уступленьні ў калгасы.

Зьдзельная сыстэма аплаты ўзьняла зацікаўленасьць калгасьнікаў у паляпшэньні гаспадаркі і пашырэньні прыбытковых галін.

У калгасах Пустышскага сельсавету, дзе ўстаноўлена зьдзельшчына, калгасьніцы зацікавіліся прамысловай сьвінагадоўляй і патрабуюць ад праўленьняў калгасаў арганізаваць сьвінаводныя гаспадаркі.

Некаторыя калгасы не даацэньваюць значэньня правільнай арганізацыі працы і зьдзельнай аплаты, палохаюцца цяжкасьці ўліку работ.

Брыгадзір «Зьвязды» ТАМІЛІН.

Бяспрытульныя... трактары

Трактарныя калёны бяз тэхнічнага нагляду. Трактарыстыя і калёнаважатыя адносяцца нядбайна да работы

Спэцыяльная рабочая брыгада Наркамзему СССР абсьледавала работу трактарных калён у калгасах БССР. Брыгада наведала Гомельскі і Мазырскі акрпаляводсаюзы, Лоеўскі і Рэчыцкі райпаляводсаюзы, Дняпроўскую с.-г. камуну, камуну «Авангард» (Дамановіцкі раён, Мазырскай акругі) і калгас «Новыя Хаданікі».

Абсьледваньне выявіла, што ў радзе месц трактары і прычэпны с.-г. інвэнтар знаходзяцца ў абураючым стане. **За трактарамі ніхто не наглядае, яны стаяць пад адкрытым небам і псуюцца.** Тое-ж самае і з прычэпным інвэнтаром.

У Дняпроўскай с.-г. камуне і ў камуне «Авангард» трактарыстыя і калёнаважатыя вельмі нядбайна адносяцца да сваёй справы і часта псуюць трактары і прычэпны с.-г. інвэнтар. У Дняпроўскай камуне трактарыстыя так вацісьнулі падшыпнікі ў трактарах, што пасьля аднаго дня работы 5 трактараў былі выведзены са строю. Падшыпнікі гэтых трактараў былі канчаткова сапсаваны.

У камуне «Авангард», трактарысты зайшоў з ліхтаром у памяшканьне, дзе знаходзіцца бэнзіна, якая ад ліхтара загарэлася і адзін трактар згарэў, а а другі таксама выбыў на доўгі час са строю. Пажар прынёс камуне страт на 3.000 руб.

Брыгада адначыла некалькі фактаў, калі ўзараныя трактарам вучасткі зямлі былі падобны на ўзарытыя знарадамі, і ні ў якім разе на нармальнае ўзораньне.

Працоўная дысцыпліна сярод трактарыстых не на належнай вышыні. Адзіначальля з боку калёнаважатых не адчуваецца.

Вельмі дрэнна стаіць справа з гаручым для трактараў. Ва ўсіх мясцох, дзе была брыгада, зусім ня было тары для трыманьня гаручага. У Дняпроўскай камуне тры бочкі бэнзіны стаяць пад адкрытым небам, па возе. Тут-жа побач знаходзяцца трактары і драўняныя будынкі. Прыблізна такі-ж малюнак і ў камуне «Авангард».

У вывадах абсьледваньня брыгада адзначыла неабходнасьць зараз-жа выдаць «Памятку трактарыстага», якая паслужыла-бы інструкцыяй для работы. Трэба забясьпечыць усе трактарныя калёны запаснымі часткамі, а таксама каталёгамі—прэйскурантамі. Трактарыстыя павінны павысіць сваю кваліфікацыю праз спэцыяльныя курсы.

* * *

21-га красавіка брыгада саюзнага Наркамзему зрабіла даклад аб выніках абсьледваньня на нарадзе пры «Белсельгасазабе». Нарада ўхваліла рад мерапрыемстваў для паляпшэньня становішча скарыстаньня трактараў. У прыватнасьці, нарада пастанавіла паслаць 4 брыгады ў раёны, дзе-згрупаваны трактарныя калёны, для абсьледваньня іх работы ў веснавую кампанію. Кожная брыгада складаецца з аднаго спэцыялістага, аднаго рабочага і аднаго прадстаўніка ад абсьледваемай акругі.

Тэрмін абсьледваньня—два тыдні.

Нарада пастанавіла прасіць Наркамвем БССР аб хутчэйшым афармленьні палажэньня аб тэхнічным дапамозе трактарным калёнам.

С. Г.

АПЭРАЦЫЙНЫЯ ЗВОДКІ З ГАСПАДАРЧАГА ФРОНТУ

За невыкананьне прамфінпляну

дырэктар галянтарэйнай фабрыкі „Беларуска“ т. Дзіканаў здымаецца з работы

Увесь час галянтарэйная фабрыка «Беларуска» працуе дрэнна. За першы квартал фабрыка выканала вытворчую праграму ўсяго НА 50 ПРОЦ. У другім квартале зроблен некаторы пералом, але ўсё-ж вытворчая праграма выканана ўсяго НА 82,3 ПРОЦ.

Асабліва ўзрос за апошні час процант браку. У гузікавым цэху брак, паводле вестак бухгальтэрыі, дасягае 25 проц. (фактычна ён значна вышэйшы). Прагулы за першае паўгодзьдзе дасягнулі 1,8 проц.

Дырэктар фабрыкі тав. ДЗІКАНАЎ бюракратычна і казённа адносіцца да прапаноў рабочых, не рэагуе на заметкі ў насьценгазэце, груба адносіцца да майстроў і рабочых. Замест жывога кіраўніцтва і практычнай дапамогі майстрам - вылучэнцам, адміністрацыя практыкуе мэтады загадаў, якіх часта нельга ажыцьцёвіць.

Ячэйка і фабком не прынялі своечасова рашучых мер, каб зьнішчыць усе ненармальнасьці, не вялі рашучай барацьбы з парушэньнямі працдысцыпліны, прастоямі, прагуламі, бракам і г. д.

БЮРО ФРУНЗАЎСКАГА РАЙКОМУ КП(б)Б, на пасяджэньні якога стаяла пытаньне аб становішчы на фабрыцы «Беларуска», улічваючы, што дырэктар фабрыкі тав. Дзіканаў ня здолеў наладзіць правільнага кіраўніцтва фабрыкі і ня здолеў павесьці рашучай барацьбы з безгаспадарчасьцю і ўсімі хваравітымі зьявішчамі, — пастанавіла АДКЛІКАЦЬ тав. ДЗІКАНАВА З ПАСТА ДЫРЭКТАРА ФАБРЫКІ.

Дырэктар ф-кі «Беларуска» тав. Дзіканаў — вінаўнік зрыву прамфінпляну.

Фабрычным арганізацыям даручана прыняць рашучыя меры да забесьпячэньня поўнага выкананьня прамфінпляну ў 2-м.

Прасоўшчыкі ўперадзе

ПРАСОЎШЧЫКІ ФАНЭРНАГА ЦЭХУ БАБРУЙСКАГА КАМБІНАТУ АРГАНІЗАВАЛІ ЎДАРНУЮ БРЫГАДУ, ЯКАЯ З КОЖНЫМ ДНЁМ ПАВЯЛІЧВАЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ. ЗАМЕСТ ВЫПУСКАНЫХ РАНЕЙ 24 КУБ. МЭТРАЎ ФАНЭРЫ, ПРАСОЎШЧЫКІ ЗАРАЗ ВЫПУСКАЮЦЬ 32-35 КУБ. МЭТРАЎ. АД ІХ НЕ АДСТАЮЦЬ І КЛЕЙШЧЫЦЫ.

Ф.

Вынікі за паўгодзьдзе

Фабрыка «Чырвоная Бярэзіна» за паўгодзьдзе выкапала сваю вытворчую праграму на **92,3 проц.** Сабекошт перавысіў плянавае заданьне на 9,6 проц. Прадукцыйнасьць працы была значна ніжэй лічбы, вызначанай плянам: замест 1.531 каробкі запалак у дзень, кожны рабочы ў сярэднім выпускаў 1.467 каробак. Такім чынам, «Чырвоная Бярэзіна» недавыканала прамфінплян **па ўсіх паказальніках.**

П. К.

Другі квартал горш за першы

Копыскія кахляныя заводы ў другім квартале працавалі горш, чым у першым. Калі ў першым квартале вытворчая праграма была **перавыканана** на 1 з пал. проц., дык у другім квартале праграма **недавыканана** па поўпроцанта. Значна павялічыўся і без таго вялікі брак: **з 14 да 17,9 проц.** Па асобных відах прадукцыі (пліткі) брак дасягае **20,5 проц.**

Прычына ў тым, што за ўвесь другі квартал рабочыя не інфармаваліся аб [illegible]

УЛ. І. ЛЕНІН АБ ЗАДАЧАХ НАРОДНАЕ АСЬВЕТЫ

Друкаваны ніжэй дакумант прадстаўляе сабою стэнаграму прамовы Ул. 1. Леніна, сказанай ім на нарадзе загадчыкаў пададдзелаў па-зашкольнае асьветы 25-га лютага 1920 г.

Прамова Ул. 1. Леніна прысьвечана задачам культурна асьветнай работы ў адпаведнасьці з практычнымі задачамі тэхнічнай і эканамічнай перабудовы краю.

Стэнаграма прамовы знаходзіцца ў архіве Інстытуту Леніна.

«Дазвольце мне ад імя Саўнаркому вітаць вашу нараду і выказаць вам па гэтаму поваду некалькі думак.

Што датычыць нашага міжнароднага становішча, я магу расказаць пра радыё, якое сёньня атрымана з Англіі і якое лепш за ўсё характарызуе гэта міжнароднае становішча. Радыё паведамляе, што ўчора, 24-га чысла, Цэнтральная рада саюзных дзяржаў прыйшла да выводу, што калі пагранічныя з Расіяй дзяржавы запытаюць у рады аб палітыцы, дык яна скажа, што ня можа раіць ім вайны, якая, бадай, пашкодзіць іх інтарэсам, і што яшчэ менш можа раіць ім наступальную вайну супроць Расіі, але, што калі Расійская Савецкая Рэспубліка зробіць напад на іх законныя межы, Саюзная рада дасьць ім падтрыманьне.

Потым паны саюзьнікі жадаюць паслаць у Расію камісію, якая належыць да камісіі працы ў Вашынгтоне. Арганізатары канфэрэнцыі, сацыял-здраднікі з Альбэртам Тома ўмовіліся аб некаторых сацыяльных рэформах і жадаюць гэту публіку, якая прадстаўляе часьць Лігі Нацый, паслаць у Расію, каб дасьледваць, наколькі ўмовы Расіі адпавядаюць звычайным патрабаваньням «цывілізаваных» дзяржаў. Гэта паведамленьне аб учарайшай пастанове саюзьнікаў ясна паказвае, як гэтыя паны заблыталіся і якую карысьць мы можам мець з іх блытаніны. Яны сотні мільёнаў выкінулі на падтрыманьне вайны (з боку ангельскае дзяржавы) і заявілі, што падтрымліваць вайну далей ня могуць. Гэтым наступацельны плян іх скончаны, хаця падвоз ваеннай амуніцыі ў Польшчу працягваецца. Яны працягваюць падвозіць зброю — у нас ёсьць дакладныя ведамасьці, што Польшча робіць перагрупоўку войск, разьлічаных на наступленьне, але аднесьціся з упэўненасьцю да іх заявы мы ня можам. Хаця цяпер на дзевяць дзесятых адпала ўсякая пагроза замежнай небясьпекі з боку саюзьнікаў, але ва ўсякім выпадку пэўная пагроза застаецца: пасьля сканчэньня вайны супроць Дзянікіна ваенную гатоўнасьць прыдзецца захаваць. На поўную дэмабілізацыю разьлічаць мы ня можам. І так, на дзевяць дзесятых небясьпека навалы міжнароднага капіталу на Расію зьнікла: яны праваліліся дастойным чынам настолькі, што выносяць каторы ўжо раз прапанову аб пасылцы камісіі ў Расію! Калі гэта камісія будзе мець у сваім складзе паноў накшталт Альбэрта Тома, які наведаў Расію ў часе вайны, дык нічога, апрача скандалу для іх і лепшага поваду для агітацыі для нас ня выйдзе. Яны жадаюць папалохаць, а калі мы скажам, што мы дарагіх гасьцей спаткаем — яны схаваюць сваю спробу. Гэта паказвае, да якой ступені яны замяшаліся. Цяпер мы маем вакно ў Эўропу, дзякуючы міру з Эстоніяй і маем магчымасьць атрымаць адтуль асноўныя прадукты. Нашае міжнароднае становішча прадстаўляе сапраўды вялізарны прагрэс і паляпшэньне: на дзевяць дзесятых ўсякая замежная небясьпека для савецкай рэспублікі адхілена.

Чым больш яна адхіляецца, тым больш мы можам заняцца работай мірнага будаўніцтва, і на вашу дзейнасьць, на вас, занятых у па-зашкольнай галіне, мы разьлічваем. Каб школьную асьвету паставіць больш салідна, для гэтага патрэбен цэлы рад матар'яльных зьмен

Чырвоныя сьцягі ў паўднёвых правінцыях Кітаю

Чырвонаармейскім рухам ахоплены ўсе правінцыі Кітаю

Паводле вестак газэт, чырвонаармейскі рух шпарка захапляе ўсе правінцыі Кітая. Ад пачатку лютага налічвалася 8 армій, да канца сакавіка іх было ўжо 14. Газэта паказвае, што новыя арміі арганізаваліся: У ПАЎНОЧНЫМ І ЗАХОДНІМ ХУБЭІ, У РАЁНЕ ЎСХОДНЯЙ РАКІ (ПРАВІНЦЫІ ГУАНДУНЬ), У ЗАХОДНІМ ФУЦЬЗЯНЕ, У РАЁНЕ ЛІНХАЙ (У ПРАВІНЦЫІ ЧЖЭЦЬЗЯН) І Ў РАЁНЕ ХАНТУНЬ (ПРАВІНЦЫІ ЦЬЗЯН-СУ). (ТАСС).

Цэлыя вёскі ахвотна далучаюцца да камуністых

ШАНХАЙ, 23. Ганконгскі ангельскі орган «Ганконг Тэлеграф» зазначае у перадавым артыкуле, што актыўнасць армій Чу-Дэ і Мао Цзэ-дуна ў апошні час значна ўзрасла. Газэта наміж іншым адзначае, што чуткі аб сьмерці Мао Цзэ-дуна ў часе бою з урадавымі войскамі не адпавядаюць сапраўднасьці. Паводле слоў газэты, трудна азначыць сапраўдную сілу камуністычнай партыі, яна ўсюды мае шматлікіх прыхільнікаў і цэлыя вёскі ахвотна далучаюцца да яе. Газэта піша: «Есьць новыя даныя, якія пацьвярджаюць, што вялізарная вобласьць, якая ахапляе звыш дзесяці паветаў пагранічных раёнаў правінцыі Фу-Цьзян, Гуандунь і Гуансі, знаходзяцца цалкам пад уладай камуністычных армій. У некаторых паветах у Анхуэйскай правінцыі, дзе занятыя камуністымі тэрыторыі не аб'яднаны ў адно цэлае, урадавыя войскі ўтрымліваюць за сабой гарадзкія цэнтры ў той час, калі прымежныя да іх раёны знаходзяцца пад уладай камуністых. (ТАСС).

Паўстанцкі сялянскі рух шпарка пашыраецца

ШАНХАЙ. Паводле атрыманых тут вестак, з 78 паветаў правінцыі Чжэцьзян 38 ахоплены паўстанцкім рухам. У руху прымаюць удзел, галоўным чынам, сяляне. У паведе Лінхай ня раз адбываліся сутычкі паміж сялянствам і Чырвонай арміяй з аднаго боку і урадавымі войскамі — з другога. У большасьці выпадкаў перамога заставалася за Чырвонай арміяй, якая разбойвала Урадавыя войскі і ўзбройвалася такім чынам сама. Многія вёскі павету Лінхай знаходзяцца ў руках Чырвонай арміі і рэвалюцыйнага сялянства.

У правінцыі Гуансі сялянскі рух шпарка распаўсюджваецца пасьля таго, як у Басэ (заходняя часьць правінцыі, паблізу граніцы Юнані) была арганізавана савецкая ўлада. У многіх вёсках арганізаваны саветы сялянскіх і армейскіх дэпутатаў.

У правінцыі Цьзянсу першыя чырвонаармейскія атрады, якія налічвалі 30 чал., зьявіліся ўпяршыню толькі ўвосень мінулага году. Гэтым атрадам удалося разьвіць вялізарнейшую работу і ўцягнуць у барацьбу больш 100 тыс. сялян.

У Ганконгу сабралася кала 24.000 бежанцаў, пераважная большасьць якіх— намецкі, вясковыя лічбы і прадстаўнікі ўлады. Усе яны ўцяклі ад сялянскіх і чырвонаармейскіх атрадаў, якія дзейнічаюць у паўднёвых і ўсходніх раёнах Гуандуня.

Паўстанцкі рух супроць ангельскага імпэрыялізму ў Індыі

ЛЁНДАН, 24. У Пэшавары (Індыя) мелі месца сур'ёзныя хваляваньні. Улады задушылі паўстаньне, адкрыўшы па паўстанцах страляніну з кулямётаў і вінтовак. 20 паўстанцаў забіта. Паўстанцы захапілі браняваны аўтамабіль, аблілі яго газэй і падпалілі. Салдаты, якія знаходзіліся ў ім, згарэлі. На рынку за-

***

ЛЁНДАН, 24. З Бамбэю паведамляюць падрабязнасьці падзей, якія адбыліся 23-га красавіка ў Пэшавары. У сувязі з арыштам 2-х членаў усеіндыйскага нацыянальнага кангрэсу вялізарны натоўп дэманстрантаў атакаваў атрады паліцыі, закідаў іх каменьнямі і прымусіў адступіць. Некалькі паліцэйскіх паранена. Тубыльнае войска, якое было выклікана на дапамогу, прабавала разагнаць дэманстрацыю, аднак, пад расшучым націскам дэманстрантаў, таксама прымушаны былі адступіць, пакінуўшы на месцы два браніяваныя аўтамабілі. Дэманстранты аблілі бранявікі газаю, зруйнавалі іх і забілі двух ангельскіх салдат, якія знаходзіліся ў бранявіках. Потым дэманстранты атакавалі будынак пошты і перарэзалі тэлеграфныя правады ў многіх часьцях гораду. На рынку дэманстранты затрымалі ангельскага салдата, які ехаў на матацыклі, і забілі яго. Быў таксама зроблены напад на будынак паліцэйскага кіраўніцтва. Тубыльнае войска пад канец дня разагнала дэманстрантаў, адкрыўшы па іх кулямётны агонь. Забіта 12 дэманстрантаў. Многія паранены. Мясцовыя ўлады чакалі нападу пагранічных плямёнаў на горад.

***

ЛЁНДАН, 24. У Калькуце адбываецца фармаваньне спэцыяльных паліцэйскіх атрадаў для барацьбы з рэвалюцыйным рухам. Усе ангельцы будуць забясьпечаны зброяй.

Паўстаньне ў Бэнгальскай правінцыі не задушана

ЛЁНДАН, 23. Паўстанцкі рух у раёне Чытагонга (Бэнгальская правінцыя) ня спыняецца.

Як паведамляе агэнцтва Рэйтэр, пры сутычках у раёне Чытагонга, учора вечарам забіты 12 паўстанцаў. Два паўстанцы цяжка паранены. Урадавыя войскі не панесьлі ніякіх страт. У раёне зроблена 14 арыштаў, аднак, асноўнае ядро паўстанцаў не разгромлена. У Фэні, у 50 мілях ад Чытагонга, паўстанцы, абараняючыся, парапілі трох паліцэйскіх.

ПАЎСТАНЬНЕ Ў АРАБІІ

ЛЁНДАН, 24. Адміральтэйства паведамляе, што ангельскае ваеннае судно «Лютык» абстрэлівала сяленьне, якое знаходзіцца на ўзьбярэжжы Эману (на Аравійскай паўвыспе), «дзе паўстанцы парушылі спакой».

Мерапрыемствы па выкананьні засеву льну і канопель

(ПАСТАНОВА СНК СССР)

МАСКВА. Па гэтым пытаньні Саўнарком Саюзу ССР прыняў пастанову, якая адзначае, што падрыхтоўка да сяўбы льну і канапель разгортваецца надзвычай марудна. Плянамі кантрактацыі іх недавыкананы, абсяўбіва ў Маскоўскай, Іванаўскай і Захоўняй воблясьцях.

У мэтах выкананьня плянаў засеваў льну і канапель Саўнарком пастанавіў: дагавары па кантрактацыі льну і канапель павінны закончацца капгасамі, зямельнымі таварыствамі і індывідуальнымі дзяньцкімі гаспадаркамі.

Запрапанаваць урадам РСФСР, УССР і БССР забясьпечыць выкананьне плянаў засеваў льну і канапель і неадкладна праверыць заключэньне дагавароў па кантрактацыі гэтых пасеваў.

Запрапанаваць ураду РСФСР наглядаць за тым, каб мясцовыя выканкомы Заходняй, Маскоўскай, Ленінградзкай і Іванаўскай абласцей не дапускалі ўстанаўленьня якасьцей не было ніякіх абавязковых норм здачы (прадажу хлеба) капгасамі, а таксама індывідуальнымі бяднякцкімі і серадняцкімі гаспадаркамі, якія ў бягучым годзе засеялі ня менш 10 проц. сваёй плошчы ільном або 5 проц. канаплямі.

Даручыць наркамгандлю СССР: вясной 1930 году забясьпечыць хлебам пасеўшчыкаў ільну і канапель у спажываючых раёнах у разьмерах паўцэнтнара на кожны закантрактаваны гэктар засеву ільну і канапель: устанавіць параённыя тэрміны здачы вапакна і насеньня паводле дагавароў кантрактацыі ў поўнай адпаведнасьці з тэрмінамі закончэньня ўборкі і першастковай апрацоўкі ільну і канапель; забясьпечыць выдачу грашовых авансаў па ўстанаўленых нормах пасеўшчыкам усёй закантрактаванай плошчы канапель і палавіны закантрактаванай плошчы ільну.

Запрапанаваць Наркамгандлю СССР разам з Наркамземам Саюзу ССР забясьпечыць засеўшчыкаў пасеўным насеньнем ільну і канапель у крэдыт, з аплатай пры атрыманьні насеньня гатоўкаю ў сярэднім 1/3 іх кошту.

Соя на Палесьсі

У гэтым годзе пад культуру соі ў СССР адводзіцца 280 тыс. гэктараў, заместь 70 тысяч гэктараў у мінулым годзе.

Соя — бабовая расьліна. Як паказвае досьвед, гэтай культуры належыць ня толькі мінулае, але і будучае. За апошнія дзесяцігодзьдзі ў такіх краёх, як Паўночныя Злучаныя Амэрыканскія Штаты, Аргентына і Манчжурыя, адбыўся сапраўдны гаспадарчы пераварот, дзякуючы пашырэньню заняткаў соі. Зараз пры сялькой разьбіцьці культуры соі мае адзвычай важнае значэньне. Адзін кілограм высокагатунковай соевай мукі адпавядае па спажыўнасьці 60-ці яйкам, або 3 л пал. кілёграмам мяса без касьцей, або 6 л пал. літрам цэльнага малака, або 2 кілёграмам масла. Усё гэта можа замяніць расьліна соя.

Паўночная мяжа соі па зерня ўстаноўлена дзяржаўным выпрабаваньнем гатункаў наступных: Жытомір, Кіеў, Харкаў, Белгарад, Остраогож, Камышын і г. д.

Тая-ж паўночная мяжа соі, але на сілос, устаноўлена наступная: Менск, Смаленск, Калуга, Рязань, Златаўст і г. д. Ураджаі насеньня соі на дасьледчых станцыях Паўночнага Каўказу ня ўзьнімаліся вышэй 5-6 цэнтн. на 1 гэктар (ніва з-за адсутнасьці клубяньку — праф. А. Віткевіч № 90 «Соц. земледелие»). У лесабярэжнай Украіне ў засушлівы 1929 год заўважалася нэўнае павышэньне ўраджаю з поўдня на поўнач.

У паўднёвай частцы стэпу — 4,8 цэнтр., паўночней у стэпы—7,5 цэнтр., паўночнае лесабярэжжа Украіны — 8-9 цэнтр., Паволжжа — саратаўская дасьледчая станцыя—11,9 цэнтр., Крашакуцкая—11,35 цэнт. (Агранам А. Матвеєў, № 90 «Соц. земледелие»).

Высокі ўраджай соі чакаецца па наліўных землях у Казакстане і сярэднязіяцкіх рэспубліках.

Такім чынам ураджаі соі ідуць за асадкамі, за вадой, пры яе абыякасных амаль адносінах да глебавых умоў, як бабовае расьліны.

Таму трэба думаць, што соя пойдзе добра і на пескавых, западна вільготных грунтовымі водамі глебах Палесьсі, а таксама пры штучным абводненьні, асабліва сокавымі водамі, напрыклад, бульбяна - крухмальных заводаў.

Ці высьвятлае насеньне соі на Палесьсі? Такога досьледу фактычна на станцыях Палесься яшчэ ня было да гэтага часу зусім. Між тым, на 8 дасьледчых станцыях Палесься сёлета закладваюцца досьледы па выпрабаваньні балотнага рысу — «Хоккайдо» і «Ооба» — скорасьпелых японскіх гатункаў далёкаўсходняй прадукцыі.

Практыка Сантахэскай дасьледчай станцыі вырашае гэтае пытаньне больш-менш станоўча — цяпла на Палесьсі на 52 град. паралелі, якая праходзіць па даліне р. Прыпяці, хопіць, да таго-ж на той-жа шырыні ў г. Канатоне высьпеў рыс «Хоккайдо» ў гэтым і мінулым годзе, насеньні ігранамам Кірвянецка, культура ня менш патрабавальная да цяпла, чым соя.

Калекцыйныя выпрабаваньні там-жа ў Сантахэзе ў працягу двух год 24 гатункаў бабоў, атрыманых ад Прыморскай с.-г. станцыі, вывезеных з Манчжурыі (станцыя «Эхо») паказалі, што насеньне соі зусім пармальна разьвілося ва ўмовах западта вільготных глеб, а ўраджайнасьць хісталася вельмі шырока ад 400—1.030 гр. на 50 расьлін.

З прычыны гэтага трэба лічыць таксама неабходным сёлета-ж зрабіць досьледы насеньня соі на ўсіх 8 станцыях Палесься, дзе будзе насеньне і рыс, асабліва трэба зьвярнуць увагу на палескую пяскова - балотную станцыю —Скрыгалава на р. Прыпяці, дзе ўмовы найбольш спрыяючыя для высьпяваньня соі. Таму затрыманьне не за намі, а за насеньнем, якое інстытут па соі мог-бы зараз-жа накіраваць у Менск—навукова - дасьледчы інстытут заг. досьлед. аддзелам Беларусі, В. В. Вінэру, бо сою па насеньне трэба сеяць на Палесьсі, відаць, не пазьней 19 мая і наогул па магчымасьці раней, як і рыс.

В. РАДЫГЕР.

Тэзісы для дакладаў аб першым маі*)

16. Першага мая зьяўляецца днём першай гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва. У гадавіну сацспаборніцтва ўвага партыі і ўсёй савецкай грамадзкасьці павінна быць сканцэнтравана на надцягненьні да перадавых калён пралетарыяту, які змагаецца за павышэньне тэмпаў разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці пасобных адсталых галін, што атрадаў. Трэба падагуліць вынікі актыўнага ўдзелу работніц у сацспаборніцтве з тым, каб зьнішчыць усе пазуўныя недахваты на гэтым важнейшым вучастку.

17. За мінулае паўгодзьдзе рабочая кляса дабілася вялікіх новых сацыяльных заваяваньняў.

За першыя пяць месяцаў году колькасьць рабочых, занятых у адной пляніуючай ВСНГ прамысловасьці, узрасла на 6,8%, а па БССР—на 26%. З кожным месяцам расьце лік рабочых, якія перадодзяцца на 7-мігадзінны рабочы дзень.

18. Прафсаюзы, зьяўляючыся прыводнымі пасам ад партыі да найшырэйшых мас рабочых, павінны стаць на чале і практычна арганізоўваць надзвычай узрослую вытворчую актыўнасьць мас у ударніцтва, сацспаборніцтва, вынаходніцтва), накіроўваючы гэту актыўнасьць на выкананьне прамфінплану, павышэньне прадукцыі працы, зьнижэньне сабекошту, павышэньне якасьці прадукцыі, зьнішчэньне вытворчых непаладак і рацыяналізацыю вытворчасьці. У адпаведнасьці з пастаўленымі задачамі прафсаюзы павінны рашуча перабудаваць сваёй работы. Праз масавы прафсаюзы рабочых, рабочы кантроль, інфэкта рабочых, чыстку прафапарату і вылучэньне рабочых на кіруючую работу — прафсаюзы павінны дабіцца каэнная перабудовы прафработы, палярызэньня яе якасьці і наближэньня да вытворчасьці.

Прафапарат у цэлым яшчэ адстае ад росту актыўнасьці шырокіх рабочых мас. Умацаваньне вытворчай дысцыпліны, змаганьне з адсталымі настроямі сярод асобных груп рабочых, палітычная культурна-выхаваўчая работа, асабліва сярод рабочых, зьвязаных з вёскай, застаюцца слабымі вучасткамі работы прафсаюзаў.

19. У значнай ступені пытаньне аб кадрабудове работы прафсаюзаў упіраецца ў праблему кадраў. Вылучэньне тысяч новых работнікаў з лепшых прадарчых, адміністрацыйных кадраў фабрык і заводаў, выхаваньне рабочых, якія ўмеюць кіраваць, з'яўляецца неадкладнейшай задачай прафсаюзаў. Пытаньне аб тэхнічных, гаспадарчых, адміністрацыйных кадрах яшчэ ня стаіць у цэнтры работы прафсаюзаў. ЦК УсеКП(б) у апошняй пастанове ад 10 красавіка завастрыў на гэтым увагу. Прафсаюзам трэба неадкладна, не на словах, а на справе, перабудаваць сваю работу пад кутом бязумоўнага выкананьня прамфінплану і ўмацаваньня пралетарскага кіраўніцтва і ўплыву на бяднацка-серадняцкія масы сялянства для змаганьня за калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва, як клясы.

У гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва прафсаюзы павінны быць на чале масавага агляду вытворчых дасягненьняў, накіроўваючы пры гэтым актыўнасьць найшырэйшых мас рабочых на выкананьне і перавыкананьне прамфінплану.

20. 1929 г. быў годам вялікага пералому ў сельскай гаспадарцы СССР.

Посьпехі калгаснага руху, якія робяць магчымай замену капіталістычнае гаспадаркі (кулацтва) буйной калгаснай гаспадаркай, паставілі ў парадак дня перад пралетарскай дыктатурай у раёнах суцэльнай калектывізацыі задачу ліквідацыі кулацтва, як клясы. Ад палітыкі абмежаваньня на аснове дасягнутых посьпехаў партыя і савецкая ўлада перайшлі да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. Паколькі кулацтва зьяўляецца той клясай, якая да апошняга часу валодала капіталістычную вытворчую базу, ажыцьцяўленьне палітыкі ліквідацыі гэтае клясы вырывае у сусьветнай буржуазіі адну з важнейшых яе апор, пазбаўляючы яе ўпутры СССР падтрыманьня кулацкай контр-рэвалюцыі. Тым самым кожны пасьпяховы крок калгаснага руху становіцца новай вехай на шляху да перамогі сусьветнага Кастрычніка.

21. Рашучы паварот бяднацка-серадняцкіх мас вёскі да сацыялізму, аказаўся магчымым дзякуючы таму, што—

а) партыя, дапамагаючы ўздыму індывідуальнае бяднацкае і серадняцкае гаспадаркі па ўсе гады пэну, вяла «правільную ленінскую палітыку выхаваньня мас, пасьлядоўна падводзячы сялянскія масы да калгасаў праз пасаджэньне каапэрацыйнай грамадзкасьці, змагаючыся як з тымі, якія прабавалі апярэдзіць рух і дэкрэтаваць разьвіцьцё калгаснага руху, ня ўлічваючы значнага актыву ўдарнікаў і асьвяжэньне за іх лік прафсаюзнага апарату--зья

Першыя вынікі самаправеркі

Як працуюць ленінскія вагонныя майстэрні

Амаль усе паказальнікі перавыкананы.--Дрэнна толькі з якасьцю работы.--Дзесяткі вагонаў, якія выпускаюцца з рамонту, патрабуюць паўторнага рамонту.--Недахопы ў рабоце тлумачацца вельмі слабым кіраўніцтвам сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам

Сьпінаю да самаправеркі

Самаправерка сацспаборніцтва ў вагонных майстэрнях імя Леніна, ст. Менск МБВ чыг., за апошні час некалькі паєднулася ўперад. Самаправеручымі брыгадамі ахоплена 70 рабочых-добраахвотнікаў. Арганізавана часовая кантрольная камісія, якая ўжо прыступіла да праверкі. Пытаньне аб задачах самаправеркі было абгаворана па адкрытых партыйных, камсамольскіх і цэхавых сходах, праведзены гутаркі ў абедзены перапынак, у цэхах вывешаны лёзунгі і газэта - плякат, якая асьвятляе ход самаправеркі.

Аднак, падрыхтоўчая і растлумачальная работа зьяўляецца далёка нездавальняючай, бо партыйны і камсамольскі актыў у самаправерцы прымае вельмі слабы ўдзел. Адміністрацыя і інжынэрна - тэхнічныя работнікі ўсё яшчэ стаяць у баку ад самаправеркі. **Давядзеньне вытворчай праграмы да рабочага месца знаходзіцца пад пагрозай зрыву.** Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі, хаця і некалькі ўзмацнілі сваю ўвагу да самаправеркі, але іх кіраўніцтва ўсё-ж зьяўляецца невыстарчальным.

Першыя вынікі

Што-ж выяўлена ў працэсе самаправеркі? Даныя, якія ёсьць у часовай кантрольнай камісіі, даюць магчымасьць зрабіць наступныя вывады.

Асноўным дасягненьнем майстэрняў зьяўляецца рацыяналізацыя некаторых працэсаў вытворчасьці, што дало за першае паўгодзьдзе **27.418 руб. эканоміі.** Найбольшы эфэкт дало скарыстаньне мятае пары з-пад паравых малатоў для ацяпленьня леса-сушні — 11.610 руб. эканоміі. Праўда, ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства прайшло праз усе бюракратычныя рагаткі. Гэта прапанова, ўнесеная рабочым тав. **Кунцэвічам** яшчэ ў 1927 годзе, была ажыцьцёўлена толькі апошнімі месяцамі. Увядзеньне сыстэмы рамонту вагонаў на 4-х-гадзінным цыклі дало скарачэньне тэрмінаў рамонту вагонаў ад 4 да 2-х дзён.

Рацыяналізацыя вытворчасьці значна сарыяла выкананьню вытворчай праграмы. Вымяральнікі НКШЗ па рамонце вагонаў за першае паўгодзьдзе выкананы **з перавышэньнем на 16 проц.,** пры чым па паасобных відах рамонту малюнак наступны: на сярэднім рамонце — 100 проц., па гадавым — 104,6 проц., па капэнцкі — 112 проц. і толькі, па ізатэрмічным — недавыкананьне на 20 проц. з прычыны адсутнасьці ў рамонце гэтага віду вагонаў.

Тэрмін рамонту зьніжаны супроць вымяральнікаў у першым квартале на 18,5 проц., а ў другім квартале — на 28 проц.

У зьніжэньні сабекошту першы квартал даў прарыў: вымяральнікі НКШЗ былі недавыкананы на 9 проц., майстэрні страцілі 6.830 руб. За тое, другі квартал даў зьніжэньне супроць вымяральнікаў на 5,8 проц. Калі прыняць над увагу, што вымяральнікі НКШЗ па зьніжэньні сабекошту зьнізілі сабекошт у параўнаньні з мінулым годам на 14,35 проц., дык атрымаем, што другі квартал даў зьніжэньне сабекошту супроць мінулага году **на 20,15 проц.** Прадукцыйнасьць працы павялічана на 10,6 проц.

Слабое месца—прагулы

Прагулы ў першым квартале складалі 608 гадзін або 0,13 проц. Праўда, у параўнаньні з першым кварталам мінулага году прагулы зьменшыліся на 0,38 проц. Яшчэ больш зьнізіліся прагулы ў другім квартале — на 48 проц. у параўнаньні з першым кварталам. Аднак, становішча з прагуламі трэба прызнаць далёка **нездавальняючым.** У некаторых цэхах колькасьць прагулаў нават пагражаючая. Напрыклад, у таварным цэху за другі квартал было 114 прагульных гадзін, а ў падсобным цэху нават 136. Трэба адзначыць, што барацьба з прагуламі вядзецца **зусім слабая.** Ёсьць выпадкі простага патураньня прагульшчыкам з боку адміністрацыі. Напрыклад, калі рабочы **Кудзіновіч,** зрабіўшы прагул у 3½ дні, цэхавай адміністрацыяй ня быў дапушчан да работы, начальнік майстэрняў тав. **Яфімаў** даволіў Кудзіновічу стаць на работу. Зразумела, што такі факт можа толькі павялічыць колькасьць прагулаў, а не паменшыць.

Безгаспадарчасьць яшчэ ня зжыта

Ня гледзячы на пэўныя дасягненьні, якія ёсьць у выкананьні вытворчай праграмы, трэба завастрыць пытаньне на многіх фактах безгаспадарчасьці, на якія ні гаспадарнікі, ні праф. і партарганізацыі не рэагуюць.

Рамонт багажнага вагону № 1803 Данецкіх чыгунак цягнецца з 16-га сьнежня мінулага году і будзе скончаны не раней 15-га мая. На працягу 3-х месяцаў вялася перапіска з кіраўніцтвам Данецкай чыгункі аб тым, як абсталяваць ацяпленьне і толькі нядаўна былі атрыманы чарцяжы. А калі ўжо трэ' было пачаць рамонт, аказалася, што прысланы праўленьнем МБВ чыгункі вадзяны кацёл не надаецца.

У студзені ШЧ Менск заказаў майстэрням 100 шт. дубовых шайб (ролікаў). У майстэрнях зрэзалі два кубаметры першагатункових дубовых дошак, затрацілі значную колькасьць рабочых дзён і варштата-гадзін і... калі заказ быў зусім гатовы, аказалася, што шайбы непатрэбны.

Іх прышлося перарабіць на меншы разьмер, што выклікала псаваньне матар'яду на 65-75 проц. Гэтае галавацтва каштавала дзяржаве звыш 600 рублёў.

У мінулым годзе майстэрні зрабілі па заказу праўленьня чыгункі, без усякіх чарцяжоў, акумулятарныя скрынкі для абсталяваньня 4-осных вагонаў, на што было затрачана прыблізна 3.000 рублёў. Не прайшло і году, як скрыні пачалі перарабляць, з аднае — дзьве, на што таксама затрачана каля 1.000 рублёў.

На барацьбу за якасьць работы

Самае хворае месца ў рабоце майстэрняў — **нізкая якасьць работы.** З агульнай колькасьці 157 пасажырскіх вагонаў, якія выпушчаны з рамонту ў першым квартале, 81 вагон, або **51,6 проц.** забракаваны ці патрабуюць паўторнага рамонту. Нават ударнікі часта выпускаюць з рамонту вагоны дрэннай якасьці. Напрыклад, ударная брыгада тав. **Дзімітровіча** выпусьціла з рамонту цялежку № 22, якая мела **19 дэфэктаў,** і вагон № 2822, які меў **12 дэфэктаў,** і вельмі істотных.

Некаторыя партыйцы і камсамольцы ў гэтым сэнсе не зьяўляюцца прыкладам. Камсамольская брыгада тав. **Мікуліча,** якая нядаўна нават атрымала прэмію, як першая ўступіўшая ў сацспаборніцтва, выпусьціла з канпэнцыйнага агляду 292 вагоны, з якіх 7 аказаліся забракаванымі. З гэтае прычыны вагоны мелі лішні прастой.

Дрэнная якасьць работы тлумачыцца слабым кіраўніцтвам і наглядам адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу, а таксама адсутнасьцю ўвагі партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

Прынцыпы адзінаначальля не ўсьвядомлены

Кепска стаіць справа з выкананьнем дырэктывы партыі аб адзінаначальлі. У цэхах адзінаначальле зусім не адчуваецца. Можна сустрэць рабочых, якія ў часе работы займаюцца прыватнымі гутаркамі. Часты выпадкі, калі рабочыя пакідаюць работу за некалькі хвілін да гудку. Быў нават заўважаны выпадак, калі рабочы выконваў у часе работы прыватны заказ. І ўсё гэта праходзіць міма вачэй цэхавай адміністрацыі. Наогул пытаньні адзінаначальля не ўсьвядомлены «трыкутнікам», не кажучы ўжо аб рабочым калектыве.

Прафарганізацыя яшчэ не перабудавалася

Ня будзе памылкай, калі мы скажам, што прычынай усіх прычын зьяўляецца **слабая і няўмелая пастаноўка прафсаюзнай работы па кіраўніцтве сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.** Заключаны ў мінулым годзе сандагавор з гомельскімі майстэрнямі амаль што не правяраўся. Сандагавары паміж асобнымі **згублены** старым складам мясцкому. У мясцкоме-ж ляжыць жмут заяў ад цэлых груп і асобных рабочых, якія падаены ў часе ленінскага закліку ударнікаў, яшчэ **неаформлены.** Майстэрні абвешчаны ўдарнымі, але афармленьня сацспаборніцтва і ўдарных брыгад **няма.** Цэхі і ўдарныя брыгады **ня маюць канкрэтных абавязацельстваў па сацспаборніцтве.**

Прафарганізацыя не перабудавала свае работы ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду. Нават тварам да вытворчасьці ажыцьцяўляецца вельмі марудна.

* * *

Задача партыйных, прафасыянальных і гаспадарчых арганізацый вагонных майстэрань зрабіць самаправерку выкананьня сандагавароў сапраўды **масавай,** уцягнуць увесь рабочы калектыў, шляхам шырока разгорнутай самакрытыкі, у выяўленьне ўсіх недахопаў у рабоце майстэрань. Больш рашуча ўдарыць па ўсіх тых, хто перашкаджае выкананьню і перавыкананьню прамфінпляну. Палепшыць кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. На практыцы ажыцьцявіць лёзунг партыі — «прафсаюзы тварам да вытворчасьці».

Будзем спадзявацца, што вагонныя майстэрні апраўдаюць сваю вялікую і гапаровую назву — **Ударных Ленінскіх Камуністычных Майстэрань.**

Брыгадзір ЦСПСБ ТРЫФСІК.

Старшыня ЧКК вагонных майстэрань КОШКІН.

АД РЭДАКЦЫІ. Гэтым артыкулам рэдакцыя «Зьвязды» пачынае друкаваць сэрыю матар'ялаў **АБ ВЫНІКАХ САМАПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ, САЦДАГАВАРОЎ І ЎДАРНІЦТВА. Просім усіх нашых рабкораў, брыгадзіраў, рэдкалегій і ўсіх рабочых і работніц прысылаць нарысы, артыкулы, заметкі аб выніках самаправеркі і аб рабоце ўдарных брыгад і асобных ударнікаў, а таксама фотаздымкі лепшых (а таксама і ГОРШЫХ) рабочых, ударнікаў, адміністратараў, прафработнікаў, якія выказалі сябе ў справе барацьбы за прамфінплян і ў кіраўніцтве сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.**

ВІЦЕБСК РЫХТУЕЦЦА ДА ПРЫНЯЦЬЦЯ ТОКУ АСІНБУЛУ

На здымку будынак падстанцыі, якая заканчваецца абсталяваньнем

Веснавая лоўля не арганізавана

Рыба ўплывае на прыватны рынак

Рыбалоўныя арцелі ня ведаюць аб ільготах для рыбацкіх гаспадарак

Рэкі, азёры, сажалкі Беларусі павінны даць сёлета 30 тыс. цэнтн. рыбы. 35 проц. гадавога пляну прыпадае на веснавы пэрыяд.

На сёнешні дзень плян веснавое лоўлі выкананы толькі на 27 проц. У некаторых-жа акругах, як Бабруйская, Аршанская, плян нявыкананы нават і на 10 проц.

У чым асноўныя прычыны слабога разгортаньня веснавое лоўлі?

Па БССР налічваецца каля 60 рыбацкіх арцеляй. Аднак, многія арцелі застаюцца «дзікімі» і ня ўцягнуты ў сыстэму саматужна-прамысловай каапэрацыі. У Бабруйскай акрузе з 9-ці рыбацкіх арцеляй каапэрацыяй ахоплена толькі некалькі. Новыя арцелі арганізацыйна не замацаваны і не афармлены. Рыбацкія арцелі ў значнай частцы не пераведзены яшчэ на новы статут.

Замест дапамогі арцелям у выкананьні веснавое лоўлі, Белсампрамсаюз і Белкалгасцэнтр вядуць спрэчкі, хто павінен кіраваць арцелямі.

Саматужна-прамысловая каапэрацыя не разгарнула работы па растлумачэньні рыбаком ільгот для рыбацкіх гаспадарак. Рыбацкія масы ня ведаюць аб гэтых ільготах. ПАСТАНОВА Саюзнага ўраду не даведзена да кожнага рыбака.

Слабую работу каапэрацыі выкарыстоўвае прыватнік для сваіх спэкуляцыйных мэт.

З Бабруйску паведамляюць, што каапэрацыя ня прымае ніякіх мер да ўцягненьня рыбакоў у сваю сыстэму. У рыбаводнай справе—поўная безгаспадарчасьць і анархія. Шмат адзіночак ловяць у рэках сецямі і нератамі вялікую колькасьць рыбы, якая паступае на прыватны рынак. У Рагачоўскім раёне 3 рыбацкія арцелі здалі рабочай каапэрацыі за 4 месяцы... 5 пудоў рыбы, а рэшта рыбы пайшла на прыватны рынак.

Гэта робіцца ў той час, калі перад «Белрыбай» і саматужна-прамысловай каапэрацыяй пастаўлена баявая задача выціснуць з рыбнага рынку прыватніка, які яшчэ ў мінулым годзе быў гаспадаром рыбнага рынку.

Пастанова наркамгандлю аб стварэньні прэміяльнага фонду для рыбакоў на суму 180.000 руб. засталася на паперы. Спажывецкая каапэрацыя, замест выкананьня дырэктывы, апрэставала не. Рыбакі не атрымалі абяцаных ім 8 мэтраў мануфактуры і 6 пачак махоркі за кожны цэнтнар рыбы. Рыбаком ня далі пакуль ні аднаго мэтра мануфактуры. Рыбакі з Мазырскай акругі скардзяцца, што каапэрацыя не выдае ім нават махоркі.

Заяўка на спэцвопратку ня выканана. Замест 800 пар рыбацкіх ботаў—Белсампрамсаюз выдаў пакуль толькі 300.

Асабліва катастрафічна становішча з сецямі. Заяўка «Белрыбы» на 160 нератоў і 5.000 пудоў нітак для вязаньня цэнтральнымі арганізацыямі не задаволена нават на 1 проц.

Мясцовыя-ж арганізацыі ня прымаюць патрэбных мер да наладжваньня выпрацоўкі сецявых матар'ялаў на фабрыцы Яропак у Менску.

Індывідуальнікі амаль не прыцягнуты да лоўлі.

Толькі і зусім нядаўна «Белрыба» дала мясцом рад паказаньняў аб стварэньні на мясцох з індывідуальнікаў спэцыяльных рыбацкіх груп, якія здавалі-б рыбу каапэрацыі арганізаваным парадкам.

Многія работнікі на мясцох яшчэ дасюль не даацэньваюць значэньня рыбы, як аднаго з галоўных элемэнтаў харчавога бюджэту рабочага; веснавая лоўля разгортваецца недапушчальна павольна.

Такія тэмпы работы пагражаюць зрывам выкананьня пляну веснавое лоўлі рыбы.

М. К—н.

НЕДАПУШЧАЛЬНА ПАВОЛЬНА ЗАГАТАЎЛЯЕЦЦА БУЛЬБА

Яшчэ ня выкананы плян адгрузкі бульбы за сакавік

У гутарцы з нашым супрацоўнікам намесьнік Наркамгандлю БССР тав. **Абрамсон** падзяліўся даўмі аб ходзе загатовак бульбы ў БССР.

— Загатоўка і адгрузка бульбы ў БССР праходзяць злачынна дрэнна, зразумела, ня з прычыны нястачы бульбы, а выключна таму, што мясцовыя і загатоўчыя арганізацыі вельмі пядбайна аднесьліся да выкананьня веснавога пляну загатоўкі і адгрузкі бульбы.

Замест таго, каб сваячасова выявіць патрэбы кожнага раёну ў насеннай бульбе з тым, каб рэшту ў тэрміновым парадку вывезьці ў раёны, дзе бульбы не хапае, на мясцох дапушчаецца рад памылак.

Кожны сельсавет, кожны РВК баіцца, што яму ня хопіць бульбы для свайго раёну і нічога ня робіць для ўзмацненьня загатовак і адгрузкі.

Да гэтага часу адсутнічае кантроль і нагляд за выкананьнем пляну.

Ёсьць рад выпадкаў, калі сельсаветы і РВК перашкаджаюць і, нават, забараняюць вываз бульбы за межы раёну.

Трэба адзначыць, што бязьдзейнічаюць ня толькі нізавыя арганізацыі, Паляводсаюз, Белкаапсаюз, а таксама і Наркамгандаль ня ведае аб ходзе загатовак і адгрузкі бульбы і, зразумела, ня можа сваячасова рэгуляваць і выпраўляць дапушчаныя на мясцох памылкі.

Ня лепш стаіць справа з рэгуляваньнем адгрузак. Нарады для пасылкі насеннай бульбы ва Узбэкістан высылаюцца з Масквы толькі 20-га красавіка, г. зн. у той час, калі насеўная кампанія ва Узбэкістане амаль што скончана.

Неабходна прыняць тэрміновыя меры, і не пазьней 10 мая дабіцца поўнага выкананьня пляну загатовак і адгрузкі бульбы.

* * *

Учора ў Наркамгандлі адбылася нарада ўсіх арганізацый, зьвязаных з загатоўкай і адгрузкай бульбы. Нарадай прыняты рад практычных мерапрыемстваў па ўзмацненьні гэтае пра-

Гарачае сьнеданьне вучням

Упяршыню МЦРК пачаў арганізоўваць гарачыя сьнеданьні ў школах. Для гэтае мэты з культбытавога фонду вызначаны спэцыяльныя сродкі.

Гэтымі днямі адбылася нарада прадстаўнікоў школьных і бацькаўскіх саветаў, акрана і камсамолу, на якой прапанавана МЦРК арганізаваць гарачае сьнеданьне для часткі дзяцей—выключна беднаты і пайшчыкаў—у 6-ці школах. На гэтай-жа нарадзе пастаноўлена наладзіць развозку гарачага сьнеданьня

Выканаць дырэктыву аб падвышэньні рэальнай зарплаты

Вылучыць на каапэрацыйную работу 10 тысяч рабочых

Пастанова прэзыдыуму УсеЦСПС

Арганізаваны УсеЦСПС брыгады для абсьледваньня работы каапэрацыі выкрылі рад буйных недахопаў у рабочым забесьпячэньні. Каапэрацыя не перабудавала мэтадаў і форм сваёй работы ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі рэканструкцыйнага пэрыяду. Ні чым іншым, як правым ухілам на практыцы, можна назваць выкрытыя брыгадамі ва многіх мясцох факты дзяйлацкага і гандлярскага ападыходу да палітыкі цэн, грубейшыя скрыўленьні клясавай лініі ў рабочым забесьпячэньні, адрыў ад мас, сувязь з прыватнікам і засьмечанасьць апарату каапэрацыі.

Прэзыдыум УсеЦСПС прызнаў, што для выкананьня дырэктывы ўраду аб ахопе каапэрацыяй рабочага бюджэту ў прамысловых раёнах да 90-95 проц. патрабуецца, **каб у бягучым годзе мясцовыя загатоўкі гародніны, малочных прадуктаў і прадуктаў птушніцтва былі павялічаны ня менш чым на 25- процантаў.** Побач з гэтым павінна быць пашырана практыка кантрактацыі гэтых прадуктаў і своечасова ажыцьцёўлены пляны будаўніцтва прыгарадных гаспадарак—малочных фэрм, агародаў і адкормачных пунктаў. У разьмеркаваньні дэфіцытных прадуктаў харчаваньня і прадметаў шырокага спажываньня патрэбна больш пасьлядоўнае правядзеньне клясавага прынцыпу і першачарговае забесьпячэньне прамысловых раёнаў.

Наркамгандаль СССР разам з каапэрацыяй і сацыяльна-бытавым сэктарам УсеЦСПС павінен ў месячны тэрмін устанавіць парадак забесьпячэньня асобных груп працоўных з тым, каб узмацніць кантроль за выдачай і карыстаньнем заборнымі кніжкамі. У такі-ж тэрмін Наркамгандаль разам з каапэрацыяй і ЦК саўгандальслужачых павінен распрацаваць парадак забесьпячэньня дэфіцытнымі таварамі, якія адпускаюцца не па заборных кніжках. Адначасова прэзыдыум УсеЦСПС лічыць патрэбным працягваць палітыку зьніжэньня цэн як за кошт каапэрацыі, так і за кошт загатоўчых арганізацый, і просіць урад паскорыць вырашэньне пытаньняў аб зьніжэньні цэн на с.-г. пражэньня цэн, **арганізаваць сапраўдны рабочы кантроль за яго правядзеньнем,** дабіваючыся прыцягненьня да адказнасьці кіраўнікоў каапэрацыйных і загатоўчых арганізацый, якія дапускаюць самавольнае павышэньне цэн. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на **грамадзкае харчаваньне:** палепшэньне якасьці і патаненьне кошту абедаў, разгортваньне грамадзкага харчаваньня непасрэдна на прадпрыемствах, у дамох-камунах і інтэрнатах.

Прэзыдыум УсеЦСПС прызнаў неабходным арганізаваць спэцыяльную камісію ў складзе прадстаўнікоў Цэнтрасаюзу, Цэрабсэкцыі, Наркамгандлю, Дзяржпляну і ЦК саюзу саўгандальслужачых для распрацоўкі пытаньняў, зьвязаных з перабудовай рабочай каапэрацыі і ўзмацненьнем уплыву прафсаюзаў на яе работу.

Прэзыдыум УсеЦСПС лічыць патрэбным у працягу бягучага году **вылучыць на работу ў рабочай каапэрацыі ня менш 10 тысяч рабочых** з тым, каб у выбарчых органах каапэрацыі было ня менш 50 проц. рабочых-вылучэнцаў, а сярод адказных работнікаў рабочая праслойка складала 75 проц.

* * *

Наш супрацоўнік меў гутарку з старшынём Белрабсэкцыі т. КУМКЕСАМ па пытаньні аб тым, як спажывецкая каапэрацыя БССР выканала дырэктывы партыі і ўраду аб рэальным павышэньні зарплаты рабочых.

Белрабсэкцыя свячасова дала рад дырэктыў аб зьніжэньні цэн цэрабкопамі. Некаторымі цэрабкопамі цэны на прамысловыя тавары, крупы, хлеб, гатовую вопратку і інш. у асноўным зьніжаны. Аднак, рад цэрабкопаў яшчэ дагэтуль дапускае вялікія налічэньні на тавары і ня прымае ўсіх мер, каб выканаць дырэктывы партыі аб зьніжэньні цэн.

Цэрабкопы на мясцох павінны перагледзець усе налічэньні на тавары з тым, каб поўнасьцю дабіцца выкананьня дырэктывы партыі аб павышэньні рэальнай зарплаты рабочых.

Трэба адзначыць, што некаторыя заготоўчыя арганізацыі ня толькі ня зьні-

выпадкі, калі гэтыя цэны павышаюцца. Напрыклад, «Белрыба» павялічвае цэны на рыбу ў параўнаньні з мінулым годам. Дзяржгандаль павялічыў цэны на яйкі і г. д. У выніку зрываецца агульная работа па зьніжэньні цэн.

Зусім слаба праходзіць зьніжэньне цэн у рабочых сталоўках. Ня гледзячы на рад дырэктыў, цэны на абеды ня зьменшаны і большасьці рабочых яны недаступны. Вялікія налічэньні ёсьць таксама на тавары і прадукты, якія прадаюцца ў буфэтах на прадпрыемствах. Трэба зараз-жа перагледзець усе цэны на тавары і прадукты, якія прадаюцца ў буфэтах, з мэтаю іх максымальнага зьніжэньня.

Да гэтага часу цэрабкопы не зьвярнулі належнае ўвагі на забесьпячэньне пайшчыкаў гароднінай.

У гэтым годзе Белрабсэкцыяй узят курс на тое, каб рабочыя раёны былі поўнасьцю забясьпечаны гароднінай. Гэта задача, можа быць выканана толькі пры ўмове, калі ўсе цэрабкопы і каапэрацыйны актыў дапамогуць правядзеньню пасеваў гароднінны. Трэба выслаць на месцы рабочыя брыгады, якія-б наглядалі за тым, каб кантрактацыя не засталася на паперы, каб калгасы выканалі ўзятыя на сябе абавязкі і поўнасьцю засялі свае гароды.

Гарачае сьнеданьне вучням

Упяршыню МЦРК пачаў арганізоўваць гарачыя сьнеданьні ў школах. Для гэтае мэты з культбытавога фонду вызначаны спэцыяльныя сродкі.

Гэтымі днямі адбылася нарада прадстаўнікоў школьных і бацькаўскіх саветаў, акрана і камсамолу, на якой прапанавана МЦРК арганізаваць гарачае сьнеданьне для часткі дзяцей—выключна беднаты і пайшчыкаў—у 6-ці школах. На гэтай-жа нарадзе пастаноўлена наладзіць развозку гарачага сьнеданьня

Агляд грамадзкага харчаваньня

Вынікі агляду па БССР невыстарчальныя

Прафарганізацыі ня кіруюць аглядавым актывам

ГАСПАДАРЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЬ НОВЫХ СТАЛОВЫХ ДАСТАЛЯВАНЬНЕМ. — ХАРЧАВАНЬНЕ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ПАЛЯВЫХ РАБОТАХ САРВАНА.

ЯК ІДЗЕ АГЛЯД ПА БССР

З дакладу прадстаўніка беларускай аглядавай камісіі на пасяджэньні ўсесаюзнай камісіі

19-га красавіка ў рэдакцыі газ. «Правда» пад старшынствам т. Круміна адбылося пасяджэньне ўсесаюзнай камісіі па агляду грамадзкага харчаваньня, на якім быў заслуханы даклад Беларускай цэнтральнай камісіі аб ходзе агляду ў Беларусі.

Выступіўшы з дакладам т. **Сяргееў** адзначыў, што агляд у Беларусі пачаўся з некаторым спазьненьнем і разгарнуўся ён, як належыць, толькі з першых ліч баў красавіка.

Цэнтральная аглядавая камісія пры рэдакцыі «Зьвязда» выканала значную арганізацыйна-прапагандысцкую работу, у выніку якой наўкола агляду былі мабілізаваны шырокія рабочыя масы.

У пачатку агляду рад каапэратараў, гаспадарнікаў і прафэсыянальных арганізацый значэньня агляду не зразумелі і яго не даацанілі. У выніку гэтага ў Беларусі агляд разгортваўся невыстарчальным тэмпам.

Тав. Сяргееў адзначыў слабыя вынікі агляду, што тлумачыцца трыма асноўнымі прычынамі, якія тармозяць, як самы ход агляду, так і дапамогу яму.

Першая прычына—гэта тая, што актыўнасьць шырокіх рабочых мас агляданым гхоплена, але кіраўніцтва гэтай актыўнасьцю з боку прафсаюзных арганізацый слабое. Яшчэ да сёнешняга дня фабрычна-заводзкія камітэты работай аглядавых камісій і рабочых брыгад ня кіруюць. Цэнтральныя праўленьні саюзаў і акруговыя прафбюро дырэктыў ЦСПСБ ня выконваюць, да справы адносьнца казённа і ў лепшым выпадку абмяжоўваюцца ўрачыстымі дэкляцыямі, далей якіх практычна нічога ня робіцца.

Другая прычына—гаспадарчыя арганізацыі да агляду не дапучыліся. У парадку агляду выяўлена, што сетка грамадзкага харчаваньня ахапляе надзвычай нязначны процант рабочых спажыўцоў і што для павялічэньня гэтай сеткі трэба разгарнуць вялікае будаўніцтва. Будаўніцтва гэта ва ўсіх акругах БССР разгарнулася, але ВСНГ яшчэ не прыстасаваў ні адно сваё прадпрыемства да вырабу патрэбнага абсталяваньня для сталовых. Такім чынам і тыя сталоўкі, будаўніцтва якіх заканчваецца, без абсталяваньня адкрыты быць ня могуць.

Трэцяя прычына—гэта вясковы сэктар. Меркавалася, што да веснавое сяўбы, да часу выхаду на палявыя работы, у вёсцы будуць арганізаваны 400 перасоўных кухань-агачоў і 200 стацыянарных сталовак. Сяўба ва ўсіх раёнах Беларусі ўжо пачалася, але на палёх ні аднэй перасоўнай кухні яшчэ няма і наўрад ці будзе. Арганізацыю гэтае справы сарвалі Белкаапсаюз і Белкалгасцэнтр, якія ня могуць дагаварыцца, хто будзе кіраваць гэтай справай. Дзяржплян і эканомнарада, пратрымаўшы плян арганізацыі харчаваньня ў вёсцы ў сваіх партфэлях звыш месяца, прызналі яго няжыцьцёвым.

Такім чынам ігнараваньне агляду гаспадарнікамі, адсутнасьць кіраўніцтва з боку прафсаюзных арганізацый не даюць магчымасьці выканаць рад істотных і надзвычай важных мерапрыемстваў па палепшэньні грамадзкага харчаваньня.

Усесаюзная камісія пастанавіла **працягнуць тэрмін агляду да 15-га мая** з такім разьлікам, каб за гэты тэрмін паправіць паданыя недахопы, прыцягнуўшы да агляду прафсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі; узмацніць асьвятленьне ходу яго на старонках друку. **Правесьці ў буйных раёнах і акругах канфэрэнцыі па грамадзкім харчаваньні,** дзе падвесьці вынікі праведзенае работы і вызначыць контуры пяцігодкі па грамадзкім харчаваньні. Такія-ж задачы паўстаюць і перад усебеларускай канфэрэнцыяй, якая павінна быць склікана ў чэрвені месяцы.

У ліпені будзе склікана ўсесаюзная парада па грамадзкім харчаваньні; на якой будуць падведзены вынікі агляду па СССР і канчаткова вызначаны асновы пяцігодкі грамадзкага харчаваньня.

Першы дом-камуна камсаставу Менскага гарнізону. На здымку дзіцячы пакой.

ЗАМАЦАВАЦЬ ВЫНІКІ АГЛЯДУ

Пастанова ўсесаюзнай аглядавай камісіі

1. Заслухаўшы даклад тав. Сяргеева аб ходзе агляду ў Беларусі, цэнтральная камісія адзначае ЗНАЧНУЮ АРГАНІЗАЦЫЙНА - ПРАПАГАНДЫСЦКУЮ РАБОТУ, ПРАВЕДЗЕНУЮ БЕЛАРУСКАЙ КАМІСІЯЙ ПА АРГАНІЗАЦЫІ МАС ВАКОЛ АГЛЯДУ, асабліва арганізуючую ў гэтых адносінах ролю газэты «Зьвязда». У выніку ўдалося прыцягнуць да агляду значныя кадры працоўных, якія выкрылі рад буйных недахопаў у грамадзкім харчаваньні.

2. Разам з тым усесаюзная аглядавая камісія канстатуе ўсё яшчэ НЕВЫСТАРЧАЛЬНАЕ ЎЦЯГНЕНЬНЕ ШЫРОКІХ МАС У АГЛЯДАВУЮ РАБОТУ, якое ў значнай меры тлумачыцца слабым удзелам і кіраўніцтвам агляду з боку прафарганізацый БССР. У той-жа час аглядавая работа не дае пажаданых вынікаў і з прычыны поўнага ігнараваньня агляду гаспадарчымі арганізацыямі Беларусі.

Ня гледзячы на нязначны ахоп грамадзкім харчаваньнем рабочага спажыўца, РАЗГОРНУТАЕ БУДАЎНІЦТВА НОВЫХ АЧАГОЎ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ ЗНАХОДЗІЦЦА ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ, З ПРЫЧЫНЫ АДСУТНАСЬЦІ ПАТРЭБНАГА АБСТАЛЯВАНЬНЯ. ВСНГБ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НІЧОГА НЕ ЗРАБІЎ ДЛЯ ПРЫСТАСАВАНЬНЯ НЕКАТОРЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ДА ВЫПУСКУ АБСТАЛЯВАНЬНЯ, ПАТРЭБНАГА РАБОЧЫМ СТАЛОЎКАМ. З другога боку, з прычыны надзвычай слабога ўдзелу ў агляде прафсаюзаў і кіраўніцтва аглядам, маюць месца асобныя выпадкі скрыўленьня лініі, кампрамэтацыі ідэі агляду і парушэньня прынцыпу масавасьці.

3. Іменна з гэтых-жа прычын грамадзкае харчаваньне ў часе палявых работ у сацыялістычным сэктары вёскі фактычна сарвана. Да пачатку сяўбы на палёх Беларусі няма ні аднэй перасовачнай кухні.

4. Лічыць аднэй з важнейшых задач цэнтральнай камісіі Беларусі—ДАБІЦЦА КАРЭННАЕ ЗЬМЕНЫ АДНОСІН ДА АГЛЯДУ З БОКУ ПРАФСАЮЗНЫХ І ГАСПАДАРЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. Прафсаюзы і гаспадарчыя арганізацыі БССР павінны ўзяць на сабе поўныя абавязкі і іх выконваць.

5. Узмацняючы асьвятленьне агляду ў друку, разгортваючы яшчэ больш крытыку і самакрытыку ў галіне грамадзкага харчаваньня, выкрываючы канкрэтных носьбітаў зла, лічыць неабходным СКАНЦЭНТРАВАЦЬ УВАГУ АГЛЯДАВАГА АКТЫВУ НА ЗАМАЦАВАНЬНІ ВЫНІКАЎ АГЛЯДУ. З гэтай мэтай трэба:

а) АРГАНІЗАВАЦЬ ДАКЛАДНЫ ЎЛІК РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ І ІХ ВЫКАНАНЬНЕ;

б) УЗМАЦНІЦЬ УДАРНІЦТВА І САЦСПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ РАБОТНІКАМІ НАРОДНАГА ХАРЧАВАНЬНЯ;

в) ПАСТАВІЦЬ НА АДПАВЕДНУЮ ВЫШЭЙШУЮ РАБОТУ ВЫТВОРЧЫХ КАМІСІЙ;

г) ЗААХВОЧВАЦЬ ВЫНАХОДНІЦТВЫ, ЯКІЯ ПАЛЕПШАЮЦЬ СПРАВУ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ;

д) ШЫРЭЙ ПРЫЦЯГНУЦЬ НАВУКОВУЮ ДУМКУ ДА СПРАВЫ ПРАВІЛЬНАГА І РАЦЫЯНАЛЬНАГА ХАРЧАВАНЬНЯ;

е) У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ПРЭМІЯВАЦЬ КІРАЎНІКОЎ І КАЛЕКТЫВЫ ТЫХ АЧАГОЎ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ, дзе ў выніку агляду чэргі і бруд будуць ліквідаваны;

ж) рашуча змагацца са спробамі некаторых каапэратараў ператварыць грамадзкае харчаваньне ў крыніцу камэрцыйных выгад.

Агляд сталовак г. Гомелю

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У цэхах швэйнай фабрыкі «Камінтэрн» праведзены гутаркі аб ходзе агляду грамадзкага харчаваньня. Вылучана некалькі брыгад, якія заняліся аглядам.

Брыгады правялі канфэрэнцыю спажыўцоў. У гэтай канфэрэнцыі прымала ўдзел 40 дэлегатаў-работніц швэйнай фабрыкі. На курсы загадчыкаў сталоўкамі вылучана адна работніца.

Растлумачальная работа па агляду таксама праведзена на цэхах абуткова фабрыкі «Прамень». Вылучана брыгада ў ліку 7 асоб для абследаваньня кухні разьмеркавальніка. Але практычна брыгада яшчэ да работы не прыступіла. Фабрычная грамадзкасьць у агляде не прымае ўдзелу. Фабком гэтай справы ня кіруе.

Ж.

Сталовая № 8 МЦРК. На здымку чарга на абед

НАШ АДКАЗ

МЕНСК

ПЕРАД 1-М МАЯ

— У дні сьвяткаваньня 1-га мая Аўтадор арганізуе аўтакалёну з мэтаю папулярызацыі аўтамабілізму і дарожнае справы.

— Першага мая ў Менску адбудзецца пробны пуск водаканалізацыі.

— 29-га красавіка ў падшэфны Халопеніцкі раён выяжджае 16 сіняблюзьнікаў клюбу друкароў. Разам з сіняблюзьнікамі выяжджае некалькі прапагандыстых культасьветных работнікаў.

— Па ўсіх школах і піянэратрадах Менску праводзіцца ўзмоцненая падрыхтоўчая праца да сьвяткаваньня 1-га мая. 30-га красавіка па ўсіх школах адбудуцца гутаркі аб першым мая. 1-га і 2-га мая праводзяцца дзіцячыя раніішнікі і інтэрнацыянальныя вечары. 2-га мая арганізоўваюцца масавыя выезды ў падшэфныя вёскі.

Пабудова менскага дому друку

СНК згадзіўся з прапанавай Дзяржпляну аб пабудове ў Менску Дому Друку з выторчасьцю да 200 мільёнаў друкаваных аркушаў. Будаўніцтва пачнецца пасьля канчатковага ўстанаўленьня тэрміну атрыманьня замежнага абсталяваньня для дому.

Спэцыялізацыя савецкіх гаспадарак

Савет Народных Камісараў пастанавіў перадаць дадаткова 10 савецкіх гаспадарак ўсесаюзнаму сьвінагадоўчаму трасту, а таксама тры саўгасы — ільнаканапляному трэсту. Перадача павінна быць скончана не пазьней 15-га мая г. г.

— Нацкамісія АВК адпусьціла 750 рублёў на арганізацыю ў 3-х нацыянальных калгасах дзіцячых пляцовак на летні час.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б

Другі куставы сход раёну наступных ячэек: Белдзяржбуду, Буд. адда. БЖС, Гандальбуду, саюзу будаўнікоў, пагелянь, Стромтрэсту, Белпайгандлю, ВСНГ, Лесбелу, заводу «Дрэваапрацоўнічык», ЦВК, Белдортрансу, Аўтакіраўніцтва, Абкамтрэсту, СНК і ЦСК.

Парадак дня: даклад РК аб рабоце. Пач. у 18 гадз. у клюбе АВК (пляц Волі). Усе партыйцы паказаных ячэек павінны зьявіцца своячасова.

Трэці куставы сход ячэек: друкарні БДВ, п.-к. «Паліграф», друкарні «Зьвязда», БАН, Белдзяржвыдавецтва, Наркамасьветы, саюзу Працасьветы, БДТ2, Белдзяржкіно, Польпэдтэхнікуму, Камвузу, політэхнікуму, музтэхнікуму і белпэдтэхнікуму.

Парадак дня: даклад РК аб рабоце. Яўка членаў паказаных ячэек абавязкова. Пач. у 18 гадз. у клюбе друкароў (Ленінская, 13).

Парттройка ЦКК УсеКП(б) у складзе т. т. Ніканорава, Шкірыча і Рыскіна 27 красавіка будзе разглядаць апэляцыі на пастанову ЦКК КП(б)Б па пытаньнях чысткі наступных таварышоў:

Кісіна Абрама Ісакавіча, Карпмана Конана Львовіча, Драбышэўскага Івана Пятровіча, Дыскіна Давіда Кіселевіча, Валіцкага Вульфа Самуілавіча, Старажова Іпаліта Васілевіча, Смольскага Цярэнція Цімохава, Дахоўкіра Марка Ізраілевіча, Гаранкова Мікіты Іванавіча, Лебедзева Сяргея Сяргеевіча, Фейгельмана Носона Залманавіча, Скоблікава Пілліпа Сымонавіча, Сідарэнкі Ігнася Антонавіча, Краснова Пятруся Мацеевіча, Барташэвіча Кастуся Уладзімеравіча, Ваўчэцкага Антона Рыгоравіча, Сідарава Пятруся Фядосава, Паўлюкевіча Аляксандра Мікалаевіча, Левіна Рувіма Мэндэлевіча, Плісава Хведара Аляксеевіча, Хоміча Ігната Тодаравіча, Лазоўскага Барыса Якубавіча, Агульніка Язэпа Лэйбавіча, Мясежнікава Юды Сімхавіча і Губельбанка Барыса Ісакавіча.

Просьба да ўсіх падаўшых апэляцыі т. т. зьявіцца на пасяджэньне парттройкі ЦКК УсеКП(б) па адрасе: гор. Менск, Савецкая 55, ЦКК КП(б)Б.

РК і ячэйкам паклапаціцца, каб усе паказаныя т. т. былі неадкладна паведамлены. Праезд за свой кошт.

Ад Менскай АКК КП(б)Б. 27-га красавіка ў 18 з пал. гадз. выклікаюцца для разгляду спраў наступныя т. т.:

ЗЬВЯЗДА.

Цапкаваты Я. Х., Ганчарык Б. А., і Фіш С. І. — яч. Гандальбуду; Голуб Ш. Л. — яч. буд. адда. БЖС; Сьвінкін Л. С., Кушнэр А. Б. і Фрыдман М. М. — саюз будаўнікоў; Бабкоў У. Н. і Дрэйзін С. С. — зав. «Бальшавік»; Дубоўскі А. Л. — яч. зав. «Бальшавік»; Астапюк У. Р., Запольскі М. І. і Фарботка У. У. —зав. «Энэргія»; Брандабоўскі С. С., Раўніцкі І. К. і Цупрынскі Я. А. — Белдзяржбуд; Варшаўчык П. М. і Грунецкі Э. А. — Хлебазавод; Гвяздовіч Я. А.— п.-к. харчавікоў.

Апрача паказаных т. т. абавязкова павінны зьявіцца сакратары ячэек, у якіх знаходзяцца гэтыя таварышы, і старшыні праверкомаў, якія праводзілі чыстку ячэек.

27 красавіка, а 19 гадз. увеч.

— назначаецца —

зборстарагаінавага АВІЯХІМАТРАДУ

ім. т. Блюхера (пам. 2-й школы, супроць пошты). Яўка абавязкова.

Праўленьне авіяхіматраду.

СЕНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 19 гадз. (пакой № 19) групавая кансультацыя для АПШ т. Будзінскага «Камінтэрн».

Дом Асьветы. У 19 гадз. сход школьнай цэхячэйкі КП(б)Б.

Вайсковы габінэт БДУ. Сёньня і заўтра з 9 да 12 гадз. мэдагляд студэнтаў 1, 2, 3 і 4 курсу, якія не прайшлі ў сьнежні 1929 г.

Адкрыты сход цэхячэйкі КП(б)Б дапкольных установаў. Пач. у 20 гадз. у Доме Асьветы.

Адкрыты сход цэхячэйкі КП(б)Б палітасьветных установаў. Пач. у 20 гадз. у Доме Асьветы.

ЗАЎТРА

БДУ. У 19 гадз. (прыродазнаўч. корпус, аўд. 4) пасядж. асьпір. гістарычн. сэмінараў. Запраш. асьпір. — гісторыкі БАН і Камвузу.

Пушкінская бібліятэка. У 9 з палов. гадз. (2-гі паверх) пасядж. бібліятэч. савету. Зьявіцца заг. біб. адда. і прыгар. хат.-чытт. Запраш. прадстаўн. прадпрыемстваў, якія карыстаюцца перасоўкамі з Пушкінскай біб-кі.

Дом Асьветы. Адкрыты камс. сход школьн. яч. Пач. у 9 гадз.

Клюб саўгандальспужачых. Адкрыты сход парткалектыву швэйнай фабрыкі «Кастрычнік». Парадак дня: 1. Даклад аб чарговых задачах партыі. Дакл. тав. Славінскі. 2. Перавыбары бюро парткалектыву. Пач. у 11 гадз.

Прыём у Беп. с.-г. акадэмію. Фрунзаўскі РК КП(б)Б паведамляе, што з 25-га па 28-ае красавіка адбываецца прыём у с.-г. акадэмію у Горках. Ячэйкам трэба правесьці растлумачальную работу сярод рабочых і не пазьней 28-га красавіка падаць заявы ў культпрап РК на т. т., якія жадаюць паступіць вучыцца.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

УСІМ СТУДПРАФАРГАНІЗАЦЫЯМ БССР.

ЦБ Пралетстуду ЦСПСБ паведамляе, што 15 мая 1930 г. у гор. Менску

СКЛІКАЕЦЦА VI УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПРАЛЕТСТУДУ БССР

з наступнаю павесткаю дня:

1. Сацыялістычнае будаўніцтва і праблема культурнай рэвалюцыі. 2. Даклад ЦБПС, УсеЦСПС. 3. Даклад ЦБПС, ЦСПСБ. 4. Даклад НК Асьветы аб становішчы нарасьветы БССР і падрыхтоўка кадраў. 5. Выбары пленуму Пралетстуду. 6. Розныя.

Модус прадстаўніцтва—1 дэлегат з правам рашаючага голасу ад 150 студэнтаў.

Іншагароднія дэлегаты павінны быць у Менску 15 мая.

ЦБ ПРАЛЕТСТУДУ.

Менскі Акруговы Камітэт Т-ва па барацьбе з алкагалізмам.

27 красавіка, а 8 гадз. увеч. у залі Камвузу (Універсытэцкая, 27)

наладжвае

грамадзкі **ДЫСПУТ** на тэму:

АЛКАГАЛІЗМ І САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Асноўны дакладчык—рэктар Камвузу т. Саевіч.

Запрашаюцца прыняць удзел прадстаўнікі: АК КП(б)Б, НКАЗдароўя, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, БАН, НКЮ, рэдактары і супрацоўнікі ўсіх газэт, СВБ, НКУС, дактары і прафэсары, рабочыя заводаў і фабрык ад антыалкагольных ячэек прадпрыемстваў і мэдфаку.

ДА ДНЮ ДРУКУ выходзіць **М. ВАСКАБОЙНІКАЎ А. КУРЦІК** **НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН**

(Апрацоўка дакладаў, зробленых на **першай Усебеларускай нарадзе рэдкалегій** фабрычна-заводзкіх газэт у красавіку 1930 г.).

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Субота, 26 красавіка, для мэталістых

„Калі пяюць пеўні"

Рэшта білетаў у касе тэатру. Пачатак а 7 гадз.

КІНО-ТЭАТР Культура

Звыш праграмы прыехаўшы з-за мяжы нямецкі вынаходца Джэфрыс дэманструе сваю вынаходку **РАДЫЁ-КАРАБЕЛЬ**.

На экране 1) мастацкі фільм „Армэкіно" **ЗАМАЛУ** ў 7 част. 2) культур-фільм **ПАМЯЦІ ІЛЬЛІЧА** ў 1 част.

Дзенныя сэансы: 1 гадз., 3 гадз., 15 м. Каса ад 12 г. дня. Цэны ад 15 к. да 35 к. Пач. вячэрн. сэанс. а 7 г. Каса—ад 5 г.

КІНО Інтэрнацыянал

Мастацкі фільм, выторч. Ленінгр. Савкіно **ХТО ВІНАВАТЫ?**

Звыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 15

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса ад 5 гадз. На дзенныя сэансы каса адчынена ад 12 гадз. дня.

КІНО Пралетары

Мастацкі нямецкі фільм паводле навэлі Стэфана Цвэйга **СТРАХ** драма ў 8 частках.

Штодзенна 3 сэансы. Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м. Каса ад 5 гадз.

1-ны дзіцячы кіно-тэатр Юны Піянэр

КУЛЬТУР-ФІЛЬМ **СЫН ПАЎДНЁЗЫХ МАРЭЙ (МОАНА)** этнаграфічны ізрыс у 7 частках.

Штодзенна 2 сэансы. Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—а 3 г. 30 м. Каса адкрыта з 12 гадз.

КІНО Спартак

Замежны мастацкі фільм **ПРАКУРОР ЁРДАН** драма ў 7 частках.

Пач. 1-га с.—7 г., 2-га с. 9-г., 3 с.-10 г. 30 м. Каса—ад 5 г.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ — ГАРАДЗКОГА УЗАЕМАДАПАМОГІ

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Савета, тэл. 12-66

АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч

Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нервовых.

Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г. 30 м. да 9 г. увеч.

Прыём хаміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзенна

Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.

Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.

Дзяжурныя дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.

Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз. раніцы.

Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту. Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

БЕЛТОРФУ **ПАТРАБУЮЦЦА** бухгальтары, рахункаводы і тэхнікі-будаўнікі —) на выезд. (—

Даведацца (вусна і пісьмова) г. Менск, Рэвалюцыйная, № 3. БЕЛТОРФ.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ ў Гомелі на кватэру ў Менску.

Даведацца: у Менску, Энгельса № 34, кв. 2; у Гомелі, АРЦЕМА № 9, ГЕЛЕР.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы пічыць несапраўднымі:

Вуч.-конск. карт. Сотвічонка П. М. 168

Асабов. пасьведч. Чаркоўскай К., выд. Мухаедзк. с-с. 169

Каан. кн. № 544 Яськевіча Б. А., выд. Фанінпальск. спаж. т-вам, каан. кн. № 24 Яськевіч Э. В., выд. Фанінпальск. спаж. т-вам 170

Вайск. біл. Рыжкова А. А., выд. 97 п. 171

Пашпарт Левікова Т., выд. Чавуск. райміліцыяй 172

Чл. кн. саюзу нархарч Бебікова Е. І. 173

Вайск. біл. Ивнікова В. А., выд. Чавуск. РВК. 174

Чл. біл. саюзу працасьветы № 1775 Шаўкуненка А. Ф. 175-1

Чл. біл. саюзу працасьветы № 1776 Шаўкуненка М. Ф. 175-2

Асабов. кн. № 794 Масло І. У., выд. Тураўск. РВК 176

Асабов. кн. Аскерка В., выд. Халопеніцк. РВК 177

Асабов. кн. Міранёнкава І. А., выд. Расьнянск. РВК 178

Чырвонаарм. кн., пасьведч. аб скапч. арт. курсаў Кармызова В. Е. 179

Асабов. кн. № 67 Міхно С. Б., выд. Лепельск. РВК. 180

Каан. кн. Жалевіч Т., выд. Пухавіцк. спаж. т-вам 181

Чл. біл. саюзу гарнікоў № 249824 Патапава Н. П. 182

Чл. біл. саюзу будаўнікоў № 6-19986 Сідарава В. Ф. 183

Чл. біл. саюзу хімікаў № 285226 Шамок Х. М. 184

Каан. кн. № 629 Буланова Л., выд. Клясьніцк. спаж. т-вам 185

Асабов. кн. № 998 Марова М. Ц., выд. Тураўск. РВК 186

Пасьведч. аб скапч. рахункаводн. курсаў за № 96 Зільберман М. С. 187

Вайск. кн. № 2247 Веціка А. Я., выд. Тураўск. РВК 188

Вайск. біл. № 2909 Геленоўскага А. Ф., выд. Бігомльск. РВК 189

Пасьведч. Сапожнікава Л. М., выд. Іванцкаўск. вайск. камісіяй 190

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

НАВІНКІ ПАСТУПІЛІ У ПРОДАЖ

А. САМАХВАЛАЎ

Пра Карла Лібкнэхта, яго жыцьцё ды змаганьне Стар. 48. Цана 22 кап.

Праз пяць год.—І. ПАПОЎ

За культурную рэвалюцыю Стар. 38. Цана 10 кап.

Царская катарга і ссылка

ФЭЛІКС КОН—Арышт і сьледзтва Стар. 62. Цана 20 кап.

П. ЛЬВОЎ МАРСІЯНІК—Катарга Стар. 63. Цана 20 кап.

Дзіцячы тэатр

Э. ГЕЗІН-ОСВАЛЬД

П'еса з жыцьця і змаганьня нямецкіх піонэраў Стар. 28. Цана 20 кап.

Ул. БАРАШКА

Буржуазныя плыні ў сучаснай літаратуры Стар. 76. Цана 23 кап.

А. БУЙСКІ

Чырвоная армія на ўнутраным фронце Стар. 76. Цана 23 кап.

Белдзяржвыдавецтва.

Госиздат РСФСР — БЕЛОРУССКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ

Литература к 1 Мая

ПРОТИВ РОСТА ВООРУЖЕНИЙ, ПРОТИВ ПОДГОТОВКИ НОВЫХ ВОЙН, В ЗАЩИТУ СССР, ЗА УСКОРЕНИЕ ТЕМПОВ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

1 МАЯ—МЕЖДУНАРОДНЫЙ ПРАЗДНИК ТРУДА

1 МАЯ 1930 Г. МАТЕРИАЛЫ ДЛЯ ДОКЛАДЧИКОВ. Библиотека агитатора. Стр. 48. Цена 8 коп.

ЛУНАЧАРСКИЙ А. В.

1 МАЯ 1930 Г. Стр. 31. Цена 5 к.

НИКОЛАЕВ Н. и БЛЮМЕНТАЛЬ А.

1 МАЯ и КРЕСТЬЯНСТВО Стр. 48. Цена 8 коп.

Развал и гниение капиталистической системы, под'ем революционного движения в капиталистических странах, колониях и полуколониях

МАНУИЛЬСКИЙ, Д. З.—Экономический кризис и революционный под'ем. Доклад и заключительное слово на расширенном президиуме исполкома Коминтерна от 18-20/II—1930 г. Стр. 63. Ц. 20 к.

МОЛОТОВ, В. — Коминтерн и новый революционный под'ем. Речь на X пленуме ИККИ 9/VII 1929 г. Стр. 76 Ц. 10 к.

ЛОЗОВСКИЙ, А. — Мировое рабочее движение на под'еме. Доклад в Пл-те Красной Профессуры 8/II—1930 г. Стр. 61. Ц. 10 к.

ЛОЗОВСКИЙ, А. — Итоги и очередные задачи международного профдвижения. (Доклад и заключительное слово на IV Конгрессе Профинтерна). Стр. 144. Ц. 70 к.

ГОТВАЛЬД, К. — Против социал-фашистской диктатуры. Речь в Чехо-Словацком парламенте 22/XII—1929 г. Стр. 32 Ц. 6 к.

СТОКЛИЦКИЙ, А. — Версаль, Дауэс, Юнг. В репарационном тупике. Стр. 48. Ц. 12 к.

НОМАД и ПОЛИТИКУС. — От плана Дауэса к плану Юнга. Стр. 141. Ц. 40 к.

ТЕЛЬМАН, Э. — Германская революция сметет план Юнга. Р. ШТЕККЕР. — План Юнга — план войны против СССР. Речи, произнесенные в германском рейхстаге 13/II—1930 г. Стр. 48. Ц. 8 к.

ТЕЛЬМАН, Э. — Германская компартия и новый революционный под'ем. Доклад на XII с'езде К. П. Германии. Стр. 184. Ц. 60 к.

КАБАКЧИЕВ ХР., БАШКЕВИЧ Б., ВАТИС Х. Д. — Коммунистические партии балканских стран. Предисл. В. Коларова. Стр. 240. Ц. 60 к.

УЛЬРИХТ, В.—Хозяйственная демократия. Перев. с немец. М. Цылова. Предисловие А. Леонтьева. Стр. 120. Ц. 60 к.

СТАЛИН, И. — О правых фракционерах в американской компартии. Стр. 48. Ц. 6 к.

НОРДМАН К. и ЛЕНСКИЙ, Г. — Правый уклон в Коминтерне. Стр. 104. Ц. 30 коп.

РОЗЕНФЕЛЬД, О. — Борьба за фабзавкомы в Германии. С предислов. А. Лозовского. Стр. 95. Ц. 20 к.

РЕММЕЛЕ, Г. — На пороге нового революционного под'ема в Германии. Перев. с нем. Л. Берга. Стр. 96. Ц. 35 к.

ЛУКНИЦКИЙ, К. — Экономический кризис в С.-А. С. Ш. Стр. 87. Ц. 30 к.

ВАРГА, Е. С. — Конец американского «процветания». Стр. 96. Ц. 20 к.

МАРТЕЛЬ, Р. — Франция и Польша. Предисл. и перев. Н. Вальдепа. Под редакцией Б. Волина. Стр. 87. Ц. 45 коп.

ЮГ. — Империализм на черном континенте. Стр. 128. Ц. 1 р.

ГАСТОВ, Г. — Японский империализм. Политико-экономический очерк. Стр. 144. Ц. 1 р. 30 к.

АБУЗИАМ, М. — Восстание в Палестине. Стр. 87. Ц. 60 к.

ГЮИ, Д. — Французский империализм в колониях. Стр. 128. Ц. 1 р.

АГОЛ, Ш. — Коминтерн и колониальный мир. Изд. 2-е. Стр. 64. Ц. 12 к.

ВАСИЛЬЕВ, В. А. — Коминтерн и его враги. Изд. 2-е. Стр. 63. Ц. 10 к.

ШНУРОВ, А. — Турецкий пролетариат. Стр. 88. Ц. 20 к.

ГРИГОРЬЕВ, В. и МАТВЕЕВ, С. — Узники капитала. Разгул фашистского террора. Стр. 80. Ц. 25 к.

КОНЦЕВИЧ, М. — Работница в Польше. Стр. 47. Ц. 10 к.

КЭНТ-КЭТИ.—Работница Англии Стр. 77. Ц. 25 ч.

ОВЕРЛАХ, Е. — Положение работницы в Германии. Стр. 64. Ц. 15 к.

ХОЛТМАН, Р. — Работница Америки. Стр. 96. Ц. 30 к.

Против „крестового похода" в защиту СССР

ЛИТВИНОВ, М. М. — Мирная политика советов. Доклад и прения на IV сессии ЦИК СССР 4-го созыва. Стр. 80. Ц. 10 к.

МОСКВИЧ, М. — Советы в борьбе за мир. Стр. 48. Ц. 8 к.

ВОРОШИЛОВ, К. — Будет ли война (книжка-копейка). Стр. 28. Ц. 1 к.

БУБНОВ, А. — Военные планы и военная действительность современного империализма. Стр. 46. Ц. 10 к.

ЛУНАЧАРСКИЙ, А. В. — Как Лига Наций делает мир. Стр. 31. Ц. 5 к.

КРУШКОЛ, Н. — Подготовка новой интервенции. (Рабочая книжка агитатора) Стр. 45. Ц. 10 к.

КАШЕН, М. — Против клеветы на Советский Союз. Речь во французском парламенте 24/XII—1929 г. Стр. 40. Ц. 5 к.

БУХАРИН, Н. — Финансовый капитал в мантии папы. Памфлет. Стр. 32. Ц. 5 коп.

КОПЕЦКИЙ, В. — Союз поповского кадила с фашистским мачом. Речь депутата в Чехо-Словацком парламенте. Стр. 16. Ц. 5 коп.

ЕЛИЗАРОВ и БУЛАТОВ. — Кулак, его святейшество папа и оборона страны. (Печ.).

ЛАПИНСКИЙ, П. — Крестовый поход против пятилетки. Стр. 64. Ц. 10 к.

БУЛАТОВ, И. — Поход в поповской рясе. О «крестовом походе» империалистов против Советского Союза. Стр. 32. Ц. 5 к.

ПЕТРОВСКИЙ, Д. — Международные обязанности пролетариата Советского Союза. (Что должен знать рабочий, вступающий в ВКП(б). Стр. 56. Ц. 10 коп.

ПАЭГЛЕ, А. — Борьба работниц капиталистических стран против войны. Стр. 62. Ц. 15 к.

За ускорение темпов социалистического строительства, за выполнение пятилетки в четыре года

МОЛОТОВ, В. — На новом этапе. Доклад о СССР на расширенном президиуме ИККИ 25 февраля 1930 г. Стр. 80. Ц. 12 к.

КАКТЫНЬ, А. — Полным ходом к социализму. Стр. 64. Ц. 10 к.

КРЖИЖАНОВСКИЙ, Г. — Хребтовый год пятилетки. Контрольные цифры на 1929/30 г. Стр. 112. Ц. 18 к.

ЛЕОНТЬЕВ, А. — Основные установки пятилетки. Изд. 3-е. Стр. 112. Ц. 30 к.

ЭССЕН, А.—Основы генерального плана народного хозяйства СССР. стр. 128 Ц. 40 к.

МАРКУС, Б. — Основные вопросы труда в 5-летке. (Б-ка журн. «Ком. Рев.»). Изд. 3-е. Стр. 109. Ц. 28 к.

ВАЙНШТЕЙН, А. С. — В поход за снижение себестоимости. Стр. 64. Ц. 18 коп.

ЭВЕНТОВ, Л. — Пятилетний план и задачи догнать и перегнать капиталистические страны. (Спутник агитатора). Изд. 3-е. Стр. 128. Ц. 20 к.

ХАВИН, А. — Не 5, а 4 года. Ускорим темп строительства. 2-е изд. Стр. 107. Ц. 15 к.

БОГУШЕВСКИЙ, В. — Через 5 лет. 3-е изд. Стр. 263. Ц. 85 к.

ТИВЕЛЬ, А. — Наши враги о пятилетке. (Б-ка жур. «Ком. Рев.»). Стр. 48. Ц. 15 коп.

АНДРЕЕВ, И. — Заем «Пятилетка в четыре года». Стр. 31. Ц. 5 к.

ХАВИН. — В бой за выполнение плана 1929-30 г. (На фронте хозяйственного строительства). Стр. 61. Ц. 10 к.

КУЙБЫШЕВ, В. — Борьба за промфинплан и ленинградская промышленность. Доклад на собрании ленинградского актива 12 февраля 1930 г. Стр. 31. Ц. 3 к.

ЛОБОВ, С., ДОГАДОВ, А. и КОСАРЕВ, А. — За выполнение промфинплана. Почему на Урале не выполнен промфинплан. Стр. 72. Ц. 5 к.

АБРАМСОН, Я., КАПЛАН, И., РЕЗНИК, З. — Война потерям! Опыт завода «Электросила». Стр. 64. Ц. 20 к.

ТУРОВСКИЙ, И. Г. — Потери в производстве. Под ред. и с предисл. Э. И. Квиринга. Стр. 48. Ц. 10 к.

УРЯШЭОН. — Как и почему нужно снижать себестоимость. Печ.

ШУЛЬМАН. — Кого бьет плохое качество продукции. Печ.

УСКОВ, Н. — Болезни капитального строительства. (На борьбу с неполадками. Серия «Работа Рабкрина». Под ред. Гольцмана). Стр. 64. Ц. 8 к.

За социалистическое соревнование, за массовое ударничество, за коммунистические цехи и заводы

ЛЕНИН, В. — Как организовать соревнование. Стр. 16. Ц. 1 к.

ЛЕНИН, В. — К вопросу о социалистическом соревновании. Три статьи. Изд. 4-е. Стр. 64. Ц. 3 к.

СВЕТИКОВ, И. — Ленинский призыв ударников. Стр. 24. Ц. 6 к.

КУЙБЫШЕВ, В. В. — Бригады социализма. Доклад на всесоюзном с'езде ударных бригад. Стр. 48. Ц. 8 к.

ПОПОВ, Н. К.—Что решил всесоюзный с'езд ударников. Стр. 64. Ц. 12 к.

ЛИТВАК, А. — Ударники ленинского призыва. Стр. 46. Ц. 8 к.

ИВАНОВ, Г. — Ударный батальон социалистического строительства. (В ногу с партией). Стр. 61. Ц. 15 к.

ЮРЬЕВ, Д. — Равняйся по лучшим. Ударники Электрозавода. Под. ред. и с предисловием А. Гольцмана. Стр. 47. Ц. 8 к.

СПИВАКОВСКИЙ. — Инженер, техник, мастер,—в ряды ленинских ударников (печ).

ЯРОВ. — Очерк из истории гусевских ударных бригад. Печ.

РЕЗНИКОВ, Д. — Ударные бригады социализма. (Б-ка агитатора). Стр. 61. Ц. 10 к.

БЕЗБОРОДОВ, С. — Первые в первых рядах. Социалистическое соревнование и ударные бригады. (Рабочая книжка агитатора). Стр. 72. Ц. 18 к.

НАБАТОВ, Г. — Под гул веретен. (Социалистическое соревнование в ленинградской текстильной промышленности). С предисловием Г. Цыперовича. Стр. 72. Ц. 30 к.

ЖЕЛЕЗНОВ, Л. — Первый перевал. (Очерки соревнования). Стр. 112. Ц. 30 к.

КАРАВАЕВА, А. — Цеха в пути. Очерки о соревновательных настроениях. Стр. 156. Ц. 60 к.

ДНЕПРОПЕТРОВСКИЙ, С.—Энтузиасты. Очерки социалистического соревнования. Стр. 118. Ц. 40 к.

ШИБАЕВ, Н. — Повышай производительность, улучшай качество. (Книжка-копейка). Стр. 13. Ц. 1 к.

БУЛЫЖНИК. — Ударные бригады на работе. (Как работать). Стр. 28. Ц. 8 коп.

ДОСОВ, Мих. — Трехгорка на ситцевом фронте. Очерк о соревновании. Стр. 47. Ц. 10 к.

ТАНДИТ, Л. — Каменские победители. Каменская фабрика на фронте социалистического соревнования. Стр. 59. Ц. 15 к.

ХАВИН, А. Ф. — От ударных бригад к ударным цехам и заводам. Стр. 56. Ц. 6 к.

ШУЛЬМАН, М. — Наши достижения на фронте социалистического соревнования. (12-я годовщина Октября). Стр. 91. Ц. 12 к.

За социалистическое переустройство сельского хозяйства. За ликвидацию кулачества, как класса, на базе сплошной коллективизации

СТАЛИН, И. — Ответ товарищам колхозникам. С приложениями: I. Постановление ЦК ВКП(б) от 2 апреля 1930 года о льготах для колхозников II. Постановление ЦИК и СНК СССР от 2/IV 1930 г. о новых льготах для колхозов и колхозников. Стр. 16. Ц. 2 к.

СТАЛИН, И.—Головокружение от успехов. К вопросам колхозного движения. Приложения: постановление ЦК ВКП(б) о борьбе с искривлениями партлинии в колхозном движении. Примерный устав с.-хозяйственной артели. Стр. 16. Ц. 2 к.

СТАЛИН, И.—К вопросу аграрной политики в СССР. Стр. 32. Ц. 5 к.

МОЛОТОВ, В.—О колхозном движении. Стр. 48. Ц. 5 к. В двух вариантах—городском и деревенском.

МОЛОТОВ, В.—Лицом к колхозному движению. Ц. 3 к.

КАЛИНИН, М. И. и ЕНУКИДЗЕ, А. С. —Сплошная коллективизация и задачи советов. Ц. 7 к.

ЕНУКИДЗЕ, А.—Сельсоветы—лицом к колхозному движению. Приложение. Основные положения об организации сельсоветов в СССР. Постановление ЦИК СССР. Изд. 2-е. Стр. 30. Ц. 5 к.

ЛЕВИЧЕВ, Т.—Сельсоветы лицом к колхозам. Стр. 93. Ц. 10 к.

ЕЛИЗАРОВ, Н. В.—Ликвидация кулачества как класса. Стр. 95. Ц. 13 к.

На новом этапе. Стр. 224. Ц. 30 к.

ЦЕХЕР, Е. А.—Партийно-общественная работа в колхозах. (В помощь рабочему-коллективизатору). Стр. 48. Ц. 8 к.

ВЕЛИКЕВИЧ, И.—Что нужно знать для правильной организации и ведения хозяйства в колхозах. Стр. 107. Ц. 25 к.

ДЕНИ

Поход на СССР. На защиту СССР

Размер 79×104. Цена 30 коп.

Художественные плакаты к 1 Мая

Художник ЕЛИСЕЕВ.

ПОБЕДНОГО ШЕСТВИЯ ПЯТИЛЕТКИ НЕ ОСТАНОВИТЬ ИМПЕРИАЛИСТАМ

Размер 102×68. Цена 40 коп.